Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан

МАТЭМАТЫКА



Частка 1

Спампавана з сайта www.aversev.by

Выдавецтва Аверсэв

Дапамагаем вучыць, дапамагаем вучыцца

Матэматыка. 3 клас. Рабочы сшытак

Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан, А. В. Жураўская, К. А. Урбан

Выданне з'яўляецца часткай вучэбна-метадычнага комплексу па матэматыцы для 3 класа і адпавядае вучэбнаму дапаможніку «Матэматыка. 3 клас» аўтараў Г. Л. Мураўёвай, М. А. Урбан. Сшытак можа быць выкарыстаны на ўроках у якасці дадатковага матэрыялу для замацавання ведаў, удасканальвання ўменняў і навыкаў, а таксама для дыферэнцыяцыі працэсу навучання.

Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

www.aversev.by

Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан

МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для **3** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2017

Спампавана з сайта www.aversev.by

УДК 51(075.2=161.3)
ББК 22.1я71
М91

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», кандыдат педагагічных навук, дацэнт *З. К. Ляўчук*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Заслаўская гімназія» (настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *М. І. Шарапа*)

Умоўныя абазначэнні:

— новы матэрыял;

— паўтарэнне вывучанага;

— дружныя задачы;

— заданне на кемлівасць;

— адкажы на пытанне, выканай заданне;

— выканай дома;

— прачытай у раздзеле «Гэта цікава!».

ISBN 978-985-559-872-6 (ч. 1)
ISBN 978-985-559-871-9

© Мураўёва Г. Л., Урбан М. А., 2013
© Мураўёва Г. Л., Урбан М. А., 2017, са змяненнямі
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2017

Спампавана з сайта www.aversev.by

Змест

Паўтарэнне вывучанага ў II класе 4

Множанне і дзяленне 28

Гэта цікава! 132



Спампавана з сайта www.aversev.by

Паўтарэнне вывучанага ў II класе

1. Запішы лікі. Колькі дзясяткаў? Колькі адзінак?



2. Напішы лікі лічбамі.

пяцьдзясят адзін | сорак | шэсцьдзясят восем

дваццаць два | сто | трыццаць дзевяць

1. У ліку 58 пяць дзясяткаў і восем адзінак.

$$58 = 5 \text{ дзяс. } 8 \text{ адз.}$$

2. Лікі 50 і 8 — разрадныя лікі.
3. Сума лікаў 50 і 8 — сума разрадных складаемых ліку 58.

$$58 = 50 + 8$$

3. Запішы лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых.

75 | 44 | 91 | 18 | 62 | 53

4. Знайдзі значэнні выразаў.

60 + 7	56 + 1	20 + 40 – 10
67 – 7	80 – 1	70 – 30 + 50
67 – 60	100 – 1	60 + 40 – 100

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Рашы задачу. Складзі адваротную задачу.
Калі прадалі 8 кг морквы, засталося 20 кг морквы. Колькі кілаграмаў морквы было?

6. У вагоне метро было 50 пасажыраў. На станцыі выйшлі 10 мужчын і столькі ж жанчын. Колькі пасажыраў засталося ў вагоне?

7. Выберы схему, якая падыходзіць. Рашы задачу.
У парку 45 ліп і бяроз, а ліп і клёнаў — 50. Чаго больш — бяроз або клёнаў? На колькі больш?

1





2



8. Колькі прамых вуглоў? Вострых вуглоў? Тупых вуглоў?



Назаві разрадныя складаемыя лікаў: 40, 58, 77.

1. Вылічы.
89 – 9 59 + 1 60 – 40 + 80

2. У школьную сталовую прывезлі 70 кг фруктаў. Яблыкаў было 30 кг, груш — 20 кг, астатнія — слівы. Колькі кілаграмаў сліў прывезлі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы і растлумач.

Прачытай роўнасць 12 + 15 = 27, выкарыстоўваючы словы: дадаць, плюс, павялічыць, сума.

2. Вылічы.

24 + 52	28 + 47	49 + 24
37 + 53	60 + 39	32 + 68

Прачытай роўнасць 69 – 24 = 45, выкарыстоўваючы словы: адняць, мінус, паменшыць, рознасць.

3. Вылічы.

88 – 46	42 – 37	100 – 55
70 – 38	54 – 49	100 – 92

4. Параўнай.

60 + 16 ? 70	46 ? 50 – 6	50 – 27 ? 33
66 + 24 ? 80	43 ? 36 + 7	75 – 50 ? 20

5. На колькі гадоў Таня старэйшая за Івана, калі Івану 8 гадоў, Тані 13 гадоў, а Пецю 9 гадоў?

6. Калі ў кошык паклалі 15 падбярозавікаў і 25 лісічак, у кошыку стала 62 грыбы. Колькі грыбоў было ў кошыку спачатку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Знайдзі даўжыню ломанай.

8. Назаві фігуры, у якіх перыметр роўны даўжыні ломанай з задання 7.



9. Кожны дарослы вядзе за руку дваіх дзяцей. Колькі дзяцей ідзе на прагулку, калі дарослых 5 чалавек?

Як да 54 дадаць 37? Як ад 54 адняць 37?

1. Знайдзі значэнні выразаў.

63 – 29	75 + 15	25 + 74 – 47
34 + 66	49 – 13	100 – 55 + 45

2. У магазіне было 34 пакупнікі. Спачатку пайшлі 15 пакупнікоў, а потым прыйшлі 7 пакупнікоў. Колькі пакупнікоў стала ў магазіне?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Запішы ў слупок. Вылічы.

23 + 62	25 + 18	36 + 20 + 44
77 + 13	73 + 27	57 + 18 + 25

Разважай так:
1. Пішу дзясяткі пад дзясяткамі, адзінкі пад адзінкамі.
2. Складваю адзінкі ... .
3. Складваю дзясяткі ... .
4. Чытаю адказ ... .

2. Запішы ў слупок. Вылічы.

59 – 36	81 – 34	100 – 61
70 – 44	62 – 58	100 – 94

Разважай так:
1. Пішу дзясяткі пад дзясяткамі, адзінкі пад адзінкамі.
2. Аднімаю адзінкі ... .
3. Аднімаю дзясяткі ... .
4. Чытаю адказ ... .

3. Знайдзі значэнні выразаў.

62 – 35 + 16	47 + 30 – 54	100 – 16 – 7

4. Параўнай.

4 дм ? 15 см	6 дм 8 см ? 68 см
71 см ? 7 дм	9 дм 1 см ? 90 см
9 дм ? 2 м	4 дм 6 см ? 1 м

5. Якіх фігур больш — трохвугольнікаў або чатырохвугольнікаў? На колькі больш?



Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Выберы схему. Рашы задачу.
Пяць трэцякласнікаў узялі ў бібліятэцы 7 кніг, а часопісаў — на 4 больш. Колькі ўсяго кніг і часопісаў узялі трэцякласнікі ў бібліятэцы?



7. Складзі і рашы задачу.

Было — ?
Паехалі — 15 ... і 23 ... .
Засталося — 22 ... .

8. У класе было 4 дзяўчынкі і 6 хлопчыкаў. З класа выйшлі 5 дзяцей. Ці быў сярод іх хаця б адзін хлопчык?

Як скласці ў слупок лікі 48 і 15?
Як адняць у слупок 15 ад 48?

1. Запішы ў слупок. Вылічы.

21 + 58	75 + 25	70 – 48
28 + 53	56 – 32	72 – 45

2. У ба́ку машыны было 45 л бензіну. Для паездкі ад дома да возера зрасходавалі 12 л бензіну, а для таго каб вярнуцца дадому, зрасходавалі столькі ж літраў бензіну. Колькі літраў бензіну засталося ў баку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы. Выканай праверку.

5 + 16 15 + 64 38 + 43 57 + 19

Складанне можна праверыць адніманнем.
Калі ад сумы адняць адно са складаемых, павінна атрымацца другое складаемае.

2. Вылічы ў слупок. Выканай праверку.

46 + 28 23 + 49 62 + 31 54 + 46

3. Выпішы правільныя роўнасці.

25 + 12 13 < 40 50 – 25 – 25 = 1

15 + 85 = 100 99 – 99 100 – 60 + 2 = 42

4. Устаў прапушчаныя лікі так, каб роўнасці былі правільныя.

78 + ? = 84 65 – ? = 39 11 = 34 – ?

? + 42 = 74 ? – 56 = 28 68 = 39 + ?

52 = ? + 13 65 = ? – 9 100 = ? + 27

5. Вылічы.

1 дм + 2 см 32 см + 4 дм 1 см – 5 дм 9 см

5 см + 2 дм 3 дм 8 см + 20 см – 1 дм 6 см

1 дм + 9 дм 5 дм 2 см – 37 см + 2 дм 5 см

6. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Для рамонту школы купілі цэмент у мяшках. Калі зрасходавалі 26 мяшкоў цэменту, засталося 15 мяшкоў. Колькі мяшкоў цэменту купілі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Спачатку адрэзалі 13 м ільнянога палатна, а потым яшчэ 22 м. Засталося 19 м. Колькі метраў палатна было?

8. Выберы схему, якая падыходзіць.
Дарожка ад уваходу ў парк да атракцыёнаў паварочвае тры разы пад прамым вуглом і адзін раз пад непрамым вуглом.



9. Знайдзі даўжыню паркавай дарожкі з задання 8, калі кожны сантыметр на схеме абазначае 10 м даўжыні дарожкі.

Прадоўжы сказы: «Складанне можна праверыць … . Для праверкі ад сумы аднімаюць … . Павінна атрымацца …».

1. Вылічы. Выканай праверку.

57 + 42 39 + 9 60 + 15 77 + 23

2. У кнізе 58 старонак. У нядзелю Арцём прачытаў 14 старонак і ў панядзелак столькі ж. Колькі старонак засталося прачытаць Арцёму?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы. Выканай праверку.

75 – 30 46 – 24 68 – 18 55 – 27

Адніманне можна праверыць складаннем.
Калі да рознасці дадаць аднімаемае, павінна атрымацца памяншаемае.

2. Вылічы ў слупок. Выканай праверку.

67 – 48 97 – 39 100 – 28 100 – 71

3. Дапоўні лікі да 100. Састаў сумы.

91 70 65 40 10 39 7 0

4. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

65 + ? = 93 ? + 34 = 77 ? – 39 = 61

5. У халадзільніку было 3 дзясяткі белых яек і яшчэ 6 штук каляровых. Мама ўзяла для прыгатавання амлету некалькі яек. У халадзільніку засталося 29 яек. Колькі яек узяла мама?

6. На рысунках паказана, а якой гадзіне Света пачала і скончыла чытаць кнігу. Колькі мінут Света чытала кнігу?

Было



Стала



Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Выберы схему, якая падыходзіць. Рашы задачу.
У Сені 12 машынак. Калі яго сястры Людзе падарылі 3 лялькі, у яе стала столькі ж лялек, колькі машынак у Сені. Колькі лялек было ў Люды?



8. Назаві фігуры. Знайдзі перыметры фігур.



9. Сабака на 4 кг цяжэйшы за кошку. Маса двух кошак роўная масе аднаго сабакі. Якая маса кошкі? Маса сабакі?

Прадоўжы сказы: «Адніманне можна праверыць … . Для праверкі да рознасці дадаюць … . Павінна атрымацца …».

1. Вылічы. Выканай праверку.

50 – 31 48 – 23 63 – 37 100 – 36

2. У вазе ляжала некалькі цукерак. У вазу паклалі 7 шакаладных цукерак і 8 карамелек. У вазе стала 30 цукерак. Колькі цукерак было ў вазе?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы і выканай праверку.

58 – 18 35 – 18 70 – 28 72 – 30

Адніманне можна праверыць адніманнем.
Калі ад памяншаемага адняць рознасць, павінна атрымацца аднімаемае.

2. Вылічы ў слупок. Выканай праверку.

94 – 31 52 – 39 100 – 55 62 – 26

3. Выканай дзеянні. Адказ запішы ў дэцыметрах і сантыметрах.

26 см + 9 см – 14 см
75 см – 30 см + 16 см
90 см – 2 дм + 4 см
6 дм – 30 см + 42 см
1 м – 5 дм – 1 см
1 м – 9 дм + 4 см

4. Састаў роўнасці па схемах.

5. Выпішы правільныя няроўнасці.

30 > 40 | 99 < 25 + 75 | 55 + 0 = 55 | 80 – 1 > 77

6. Даўжыня адной стараны трохвугольніка 30 см, другой — столькі ж сантыметраў. Знайдзі даўжыню трэцяй стараны трохвугольніка, калі перыметр трохвугольніка роўны 8 дм.

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Кірыл раніцай 10 мін робіць зарадку, 10 мін мыецца і 10 мін снедае. Ці хопіць яму гадзіны, каб паспець зрабіць усе гэтыя справы?

8. Разгледзь схему. Рашы задачу. Пасадзілі 60 дрэў. З іх 26 дубоў, астатнія — каштаны. Якіх дрэў пасадзілі больш і на колькі больш?



9. Устаў прапушчаныя знакі, каб роўнасці былі правільныя.

22 ? 8 ? 4 = 26 38 – 26 ? 45 ? 13 = 44

73 ? 7 ? 8 = 88 57 + 28 ? 22 ? 37 = 100

10. Па дарозе адно за адным ідуць 7 дзяцей. За кожным хлопчыкам, акрамя апошняга, ідзе дзяўчынка. Колькі дзяўчынак ідзе па дарозе?

Прадоўжы сказы: «Адніманне можна праверыць адніманнем. Для праверкі ад памяншаемага адніма-юць … . Павінна атрымацца …».

1. Вылічы. Выканай праверку.

46 – 26 51 – 37 64 – 18 100 – 88

2. Купілі 13 кг цыбулі і некалькі кілаграмаў буракоў. Усяго купілі 31 кг цыбулі і буракоў. На колькі кілаграмаў цыбулі купілі менш, чым буракоў?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вызнач парадак дзеянняў. Вылічы.

23 + 34 − 27 45 − 12 + 35 54 + 45 − 78

Калі ў выразе НЯМА ДУЖАК і ён утрымлівае толькі складанне і адніманне, то дзеянні выконваюць па парадку злева направа.

2. Вызнач парадак дзеянняў. Прачытай выразы. Вылічы.

56 – (13 + 12) 70 + (56 – 29) (24 + 45) – 16

78 – (47 – 36) 20 + (20 + 40) 64 – (39 – 9)

Калі ў выразе ЁСЦЬ ДУЖКІ, то дзеянні ў дужках выконваюць першымі.

3. Састаў выразы па схемах. Вылічы.





4. Выпішы правільныя няроўнасці.

21 < 23	20 > 72 − 50	46 + (16 − 12) > 50 − 1
13 > 13	38 + 8 < 50	100 – (13 + 13) < 80 – 5

5. У кіёску было 53 калькулятары. Прадалі 18 вялікіх калькулятараў і некалькі маленькіх. У кіёску засталося 20 калькулятараў. Колькі маленькіх калькулятараў было прададзена?

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Складзі і рашы задачы.





7. Дзеці пачалі выконваць дамашняе заданне ў 17 г, а закончылі праз 40 мін. Які гадзіннік паказвае той час, калі дзеці пачалі выконваць дамашняе заданне? Калі закончылі выконваць дамашняе заданне?



8. Максім сарваў на 14 яблыкаў больш, чым Насця. Максім даў Насці 8 яблыкаў. У каго з іх яблыкаў стала больш і на колькі больш?

Якое дзеянне выконваюць першым у выразах з дужкамі?

1. Запішы выразы і знайдзі іх значэнні.

Да рознасці лікаў 37 і 22 дадаць лік 64.

Ад ліку 100 адняць суму лікаў 79 і 11.

2. Для будаўніцтва дома ў першы дзень прывезлі 46 бярвён, а ў другі — на 18 бярвён менш. Колькі ўсяго бярвён прывезлі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Замяні складанне множаннем.

4 + 4 + 4 10 + 10 + 10 + 10 12 + 12

2. Замяні множанне складаннем. Вылічы.

5 · 2 15 · 3 30 · 3 42 · 2

Прачытай роўнасць 10 · 2 = 20, выкарыстоўваючы словы: памножыць, множнікі, здабытак.

3. Прачытай выразы. Вылічы.

2 · 6 8 · 3 9 · 2 3 · 5

4. Растлумач па рысунках роўнасці.

10 : 5 = 2 10 : 2 = 5



18 : 3 = 6 18 : 6 = 3

Прачытай роўнасць 20 : 2 = 10, выкарыстоўваючы словы: падзяліць, дзялімае, дзельнік, дзель.

5. Прачытай выразы. Вылічы.

12 : 3 12 : 4 18 : 2 18 : 9

6. Зрабі схемы па ўзоры. Вылічы.



2 · 3 + 2 = 2 · 4 = 8

4 · 2 + 4 3 · 3 + 3

2 · 4 + 2 5 · 2 + 5

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Запішы выразы. Знайдзі іх значэнні.
- Да рознасці лікаў 65 і 60 дадаць 95.
- Ад ліку 43 адняць рознасць лікаў 20 і 7.
- Ад сумы лікаў 53 і 29 адняць лік 33.
- Да сумы лікаў 38 і 17 дадаць 45.

8. Дапоўні ўмову і рашы задачу.
У аднаго веласіпеда … колы. Колькі колаў у 6 веласіпедаў?

9. Бабуля раздала 12 піражкоў унукам па 3 піражкі кожнаму. Колькі ўнукаў у бабулі?

10. Дапоўні ўмову задачы адказам задачы 9. Складзі пытанне. Рашы задачу.
Бабуля раздала 8 піражкоў ? унукам пароўну кожнаму.

11. Маса аўчаркі Рэкса 35 кг. Гэта на 20 кг больш за масу пудзеля Артамона. Якая маса Рэкса і Артамона разам?

Прачытай правільную роўнасць.

$5 + 5 + 4 = 5 \cdot 3$ $2 \cdot 4 = 2 + 2 + 2 + 2$

1. Вылічы.
$3 \cdot 4$ $2 \cdot 7$ $8 \cdot 3$ $3 \cdot 5$

2. У класе 8 сталоў. Колькі вучняў у класе, калі за кожным сталом сядзяць 2 вучні?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Як можна палічыць колькасць клетак рознымі спосабамі? Састаў роўнасці па ўзоры.





Ад перастаноўкі множнікаў здабытак не мяняецца.

2. Параўнай.

2 · 3 ? 3 · 2	5 · 2 ? 2 + 5	2 · 12 ? 12 · 3
2 · 8 ? 8 · 2	4 + 3 ? 3 · 4	5 · 13 ? 14 · 5

3. Вылічы.

2 · 4 + 48	3 · 8 – 6	6 · 2 + 45
12 : 4 + 5	27 : 9 + 16	18 : 3 – 0

4. Устаў прапушчаныя лікі так, каб няроўнасці былі правільныя. Колькі такіх лікаў?

7 · 3 < 23 – ? 16 : 2 > 5 + ? 2 · 5 > ? + 1

5. Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Кубкаў у адным сервізе	Колькасць сервізаў	Кубкаў ва ўсіх сервізах
6	3	?

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Віця падзяліў 18 жалудоў паміж сабой і двума сябрамі пароўну. Колькі жалудоў атрымаў кожны?

7. Разгледзь схемы. Рашы задачу.
У каробцы фламастараў на 16 больш, чым алоўкаў. У каробку паклалі яшчэ 9 алоўкаў. Якіх прадметаў стала ў каробцы больш — алоўкаў або фламастараў? На колькі больш?

	Было	Стала
		

8. Тата паглядзеў па тэлевізары дакументальны фільм, перадачу «Навіны» і прагноз надвор'я. Фільм доўжыўся 35 мін, перадача «Навіны» — 20 мін. Колькі мінут доўжыўся прагноз надвор'я, калі тата глядзеў тэлевізар адну гадзіну?

Выберы правільныя роўнасці.

$2 \cdot 3 = 3 \cdot 2$ $3 \cdot 7 = 7 + 3$ $24 \cdot 2 = 2 \cdot 24$

1. Вылічы.

$3 \cdot 6$	$2 \cdot 8$	$9 \cdot 3$	$10 \cdot 2$
$6 \cdot 3$	$8 \cdot 2$	$3 \cdot 9$	$2 \cdot 10$

2. У парку Дружбы народаў павінны пасадзіць 90 ясеняў і бяроз. Ужо пасадзілі 32 ясені і 25 бяроз. Колькі дрэў засталося пасадзіць?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Растлумач па рысунку роўнасці.



$2 \cdot 9 = 18$
$9 \cdot 2 = 18$
$18 : 2 = 9$
$18 : 9 = 2$

Калі здабытак двух множнікаў падзяліць на адзін з іх, то атрымаецца другі множнік.

2. Які з трох лікаў з'яўляецца здабыткам двух іншых? Якія два лікі з трох — дзеллю? Састаў роўнасці.

2	8	4		18	6	3		3	9	27		5	10	2

3. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$52 + 4 + ? = 59$
$37 - 2 - ? = 33$
$99 - 5 - ? = 91$
$76 + 3 - ? = 77$
$64 + 3 + ? = 68$
$8 + 6 + ? = 54$

4. Складзі і рашы задачы.

Маса аднаго пакета (кг)	Колькасць пакетаў (шт.)	Маса ўсіх пакетаў (кг)
7	3	?
7	?	21
?	3	21

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Даўжыня прамавугольніка 21 см, а шырыня на 2 см меншая. Знайдзі перыметр гэтага прамавугольніка.

6. Кожную старану прамавугольніка з задання 5 паменшылі на 17 см. Назаві нумар прамавугольніка, які атрымаўся.

1

2

3 

7. Пяцярым шчанятам далі па дзве костачкі і яшчэ тры костачкі далі шостаму шчаняці. Колькі костачак раздалі шчанятам?

8. Устаў прапушчаныя лічбы, каб роўнасці былі правільныя.

61 + 2* = *5 5* + 19 = *6 32 + *8 = 8*

73 – 4* = *1 8* – 67 = *4 45 – *9 = 2*

9. У Машы, Каці і Лены былі кніга, часопіс і альбом. У Лены не было альбома і часопіса, у Машы не было альбома. Які прадмет быў у кожнай дзяўчынкі?

Закончы сказ: «Калі здабытак двух множнікаў падзяліць на адзін з іх, то атрымаецца …».

1. Вылічы.

2 · 7 7 · 2 14 : 2 14 : 7

2. Мама падзяліла 12 апельсінаў пароўну паміж сястрой і двума братамі. Колькі апельсінаў атрымала кожнае дзіця?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Успомні табліцу множання з лікам 2.

•	2	3	4	5	6	7	8	9
2	4	6	8	10	12	14	16	18

1. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Множнікі 2 і 4.
Дзель лікаў 16 і 8.
Множнікі 6 і 2.
Здабытак лікаў 7 і 2.
Дзялімае 18, дзельнік 9.
Дзель лікаў 10 і 5.

2. Вылічы.

$2 \cdot 8 - 15$ $\quad$ $2 \cdot 5 + 10$ $\quad$ $2 \cdot 9 - 9$

$16 : 8 + 5$ $\quad$ $14 : 7 + 23$ $\quad$ $18 : 9 + 31$

3. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$7 \cdot ? = 14$ $\quad$ $2 \cdot ? = 10$ $\quad$ $? \cdot 6 = 12$

$? \cdot 2 = 18$ $\quad$ $? : 2 = 4$ $\quad$ $8 : ? = 2$

4. Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Кветак у адной вазе	Колькасць ваз	Усяго кветак
?	2	18

5. У заапарку было 85 звяроў і птушак. Звяроў было 56. У гэтым годзе ў заапарк прывезлі яшчэ 10 птушак. Колькі птушак стала ў заапарку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Складзі і рашы задачу.



7. Параўнай.

2 дм · 3 ? 3 дм · 2 15 кг · 2 ? 14 кг · 2

6 мін · 2 ? 2 мін · 5 10 л · 2 ? 10 л · 3

8. Вылічы.

(27 + 39) – 48 100 – (12 + 67) 55 + (92 – 74)

9. Знайдзі перыметр кожнага трохвугольніка.



10. У кошык для захоўвання мячоў змяшчаецца 20 чырвоных мячоў або 15 сініх мячоў. Якія мячы па памеры меншыя — чырвоныя або сінія?

Якія лікі ад 1 да 20 дзеляцца на 2?

1. Вылічы.

2 · 3 2 · 9 39 + 27

8 : 2 12 : 2 68 – 36

2. Даўжыня стараны квадрата 2 дм. Знайдзі перыметр квадрата.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Успомні табліцу множання з лікам 3.

•	2	3	4	5	6	7	8	9
3	6	9	12	15	18	21	24	27

1. Знайдзі пары лікаў, здабытак якіх роўны:

6 12 15 24

2. Знайдзі пары лікаў, дзель якіх роўная:

6 4 9 3

3. Вылічы.

3 · 8 + 3	3 · 5 + 15	3 · 2 · 3
9 · 3 – 3	6 · 3 – 9	2 · 2 · 3
2 · 9 : 6	16 : 2 · 3	3 · 3 · 3

4. Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

Множнік	9	?	5	?	4	7
Множнік	3	8	?	6	3	?
Здабытак	?	24	15	18	?	21

5. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Да здабытку лікаў 3 і 8 дадаць 10.
- Ад дзелі лікаў 18 і 2 адняць 0.
- Здабытак лікаў 2 і 5 павялічыць на 70.
- Дзель лікаў 27 і 9 паменшыць на 3.

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Складзі і рашы задачу.



7. Мама прыгатавала 5 слоікаў джэму. На кожны слоік пайшло па 1 шклянцы ягад і па 2 шклянкі цукру. Колькі шклянак ягад і цукру пайшло на ўвесь джэм?

8. У гадавальніку вырасцілі 65 кустоў чорнай парэчкі і 35 кустоў чырвонай. Калі некалькі кустоў парэчкі было прададзена, засталося 19 кустоў. Колькі кустоў парэчкі было прададзена?

9. Ігар мые 6 талерак за той жа час, што і 8 кубкаў. Што ён мые хутчэй — талерку або кубак? Што ён вымые хутчэй — 5 талерак або 5 кубкаў?

Якія лікі ад 1 да 30 дзеляцца на 3?

1. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

7 · ? = 21	8 · ? = 24	? · 6 = 18
15 : ? = 3	24 : ? = 3	? : 3 = 3

2. Першакласнікі сабралі 40 кг макулатуры, а другакласнікі — на 7 кг менш. Вучні трэцяга класа сабралі на 12 кг макулатуры больш, чым другакласнікі. Колькі кілаграмаў макулатуры сабралі трэцякласнікі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Множанне і дзяленне



$4 \cdot 9 = 9 \cdot 4$

Растлумач і запомні.

$4 \cdot 4 = 16$
$4 \cdot 5 = 20$
$4 \cdot 6 = 24$
$4 \cdot 7 = 28$
$4 \cdot 8 = 32$
$4 \cdot 9 = 36$

$5 \cdot 4 = 20$
$6 \cdot 4 = 24$
$7 \cdot 4 = 28$
$8 \cdot 4 = 32$
$9 \cdot 4 = 36$

1. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Множнік	8	4	4	7	4	6
Множнік	4	5	9	4	4	4

2. Вылічы.

$4 \cdot 5 + 4$ $\quad$ $4 \cdot 7 + 4$ $\quad$ $4 \cdot 9 + 4$
$4 \cdot 5 - 4$ $\quad$ $4 \cdot 7 - 4$ $\quad$ $4 \cdot 9 - 4$

3. Вылічы.

58 см + 12 см – 34 см $\quad$ 8 см · 4 + 6 дм 8 см
10 дм – 36 см + 42 см $\quad$ 4 см · 9 – 3 дм 6 см

4. На адной паліцы 8 кніг. Колькі кніг на 4 такіх паліцах?

5. Змяні лікі ва ўмове задачы 4 так, каб адказ стаў меншым.

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Параўнай задачы. Выберы схему да кожнай задачы. Рашы задачы.

- У каробцы было 25 жоўтых, зялёных і чырвоных кубікаў. Колькі кубікаў узялі з каробкі, калі ў ёй засталося 13 жоўтых і 2 зялёныя кубікі?
- У каробцы было 25 жоўтых, зялёных і чырвоных кубікаў. Колькі кубікаў засталося ў каробцы, калі з яе ўзялі 13 жоўтых і 2 зялёныя кубікі?



7. Для ўпрыгожвання вокнаў да навагодняга свята ў Наташы было на 15 выцінанак больш, чым у Алесі. Алеся зрабіла яшчэ 20 выцінанак. У каго цяпер выцінанак больш? На колькі выцінанак больш?

8. Выберы выраз, з дапамогай якога можна вылічыць даўжыню ломанай. Знайдзі даўжыню ломанай.

$2 \cdot 3 + 3$ $2 \cdot 4 + 3$ $2 \cdot 5 + 2$ $2 \cdot 4 + 2$

Прылічвай па чатыры, пачынаючы ад ліку чатыры, да ліку сорак.

1. Вылічы.

$24 : 3$ $14 : 7$ $9 \cdot 4$ $4 \cdot 7$

2. На будоўлі трэба ўстанавіць 100 м агароджы. У першы дзень устанавілі 45 м агароджы, а ў другі — 30 м. Колькі метраў агароджы засталося ўстанавіць?

Спампавана з сайта www.aversev.by



$4 \cdot 5 = 20$
$20 : 5 = ?$
$20 : 4 = ?$

Растлумач і запомні.

$4 \cdot 4 = 16$
$4 \cdot 5 = 20$
$4 \cdot 6 = 24$
$4 \cdot 7 = 28$
$4 \cdot 8 = 32$
$4 \cdot 9 = 36$

$16 : 4 = 4$
$20 : 4 = 5$
$24 : 4 = 6$
$28 : 4 = 7$
$32 : 4 = 8$
$36 : 4 = 9$

$20 : 5 = 4$
$24 : 6 = 4$
$28 : 7 = 4$
$32 : 8 = 4$
$36 : 9 = 4$

1. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Дзялімае	20	32	36	28	16	24
Дзельнік	4	8	4	7	4	6

2. Вылічы.

$45 - 40 + 79$
$100 - 48 + 17$
$(50 - 43) + 76$
$70 - (20 - 8)$
$65 - 65 + 99$
$58 + 25 - 82$

3. Вылічы. Выканай праверку.

$27 + 64$ $83 - 29$ $51 - 17$ $36 + 44$

4. Саша падзяліў 20 сліў па 4 слівы паміж сабой і сваімі сябрамі. Колькі сяброў атрымала слівы?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Маса аднаго кавуна (кг)	Колькасць кавуноў (шт.)	Маса ўсіх кавуноў (кг)
?	4	24

6. Выберы схему. Рашы задачу.
У аўтобусе было 47 пасажыраў. На трох прыпынках выйшлі па 4 пасажыры. Колькі пасажыраў засталося ў аўтобусе?

1



2



7. Выразі ў мінутах.

1 г 15 мін | 1 г 30 мін | 1 г 40 мін | 1 г 23 мін

Выразі ў гадзінах і мінутах.

70 мін | 80 мін | 95 мін | 66 мін

Адлічвай па чатыры, пачынаючы ад ліку сорак.

1. Вылічы.

4 · 8	32 : 4	32 : 8	9 · 4
5 · 4	20 : 5	20 : 4	7 · 4

2. У бочцы было 70 л квасу. Да абеду прадалі некалькі літраў квасу, а пасля абеду — 32 л. У бочцы засталося 24 л квасу. Колькі літраў квасу прадалі да абеду?

Спампавана з сайта www.aversev.by

На паліцы 3 кубкі, а шклянак — у 2 разы больш. Колькі шклянак на паліцы?

Кубкаў — 3
Шклянак — ?, у 2 разы больш



1. Выберы схему да кожнай задачы. Рашы задачы.

- Галя купіла 2 паштоўкі, а Вольга — **на 3** паштоўкі больш. Колькі паштовак купіла Вольга?
- Галя купіла 2 паштоўкі, а Вольга — **у 3 разы** больш. Колькі паштовак купіла Вольга?



2. Складзі і рашы задачы.



3. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Множнікі 8 і 3.
- Лік 8 павялічыць у 3 разы.
- Здабытак лікаў 4 і 9.
- Лік 4 павялічыць у 9 разоў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Вылічы.

28 : 7 · 5	80 – 56 + 19	36 + 29 + 14 + 11
36 : 4 · 3	90 – 4 – 10	42 + 15 + 28 + 5

5. Устаў прапушчаныя знакі дзеянняў, каб атрымаліся правільныя роўнасці.

24 ? 4 = 20	32 ? 8 = 4	27 ? 9 = 3
24 ? 4 = 6	32 ? 8 = 40	27 ? 9 = 18

6. Падчас адпачынку на Нарачы Іра зрабіла 35 фатаграфій, што на 12 фатаграфій больш, чым зрабіў яе брат. Колькі ўсяго фатаграфій зрабілі дзеці?

7. У пляжны валейбол гулялі 12 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак. Балельшчыкаў было на 21 больш, чым іракоў. Колькі было балельшчыкаў?

8. Начарці ломаную, даўжыню якой можна вылічыць так:

3 см · 2 + 4 см

Прачытай выразы, выкарыстоўваючы слова «павялічыць».

8 · 4 3 · 5

1. Параўнай.

3 · 8 + 3 ? 3 · 9	7 дм 8 см ? 87 см
4 · 9 – 4 ? 4 · 8	9 дм 4 см ? 94 см

2. Дзве групы дзяцей рыхтавалі прэзентацыю. Адна група падрыхтавала 15 слайдаў. Гэта на 7 слайдаў менш, чым падрыхтавала другая група. Колькі слайдаў было ў прэзентацыі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Было 6 маленькіх ракетак, а вялікіх — у 2 разы менш. Колькі было вялікіх ракетак?



Маленькіх — 6
Вялікіх — ?, у 2 разы менш



1. Выберы схему да кожнай задачы. Рашы задачы.

- У гуртку робататэхнікі 6 хлопчыкаў, а дзяўчынак — **на 3** менш. Колькі дзяўчынак у гуртку?
- У гуртку робататэхнікі 6 хлопчыкаў, а дзяўчынак — **у 3 разы** менш. Колькі дзяўчынак у гуртку?





2. Сыну 6 гадоў. Колькі гадоў маме, калі яна ў 4 разы старэйшая за сына?

3. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Дзялімае 16, дзельнік 4.
- Лік 16 паменшыць у 4 разы.
- Дзель лікаў 24 і 6.
- Лік 24 паменшыць у 6 разоў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Складзі задачу па кароткім запісе. Рашы задачу.

I — 25 разоў
II — столькі ж разоў
III — ?, на 12 менш, чым

5. На колькі адзін лік большы або меншы за другі?

99 і 48	24 і 70	82 і 29
12 і 45	28 і 16	42 і 100

6. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Павяліч у 3 разы

?	?	?	?	?
9	8	6	5	4
?	?	?	?	?

Павяліч на 3

7. Знайдзі даўжыню стараны квадрата, перыметр якога роўны 32 см.

Прачытай выразы, выкарыстоўваючы слова «паменшыць».

27 : 9 36 : 4

1. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

4 · ? = 36	7 · ? = 21	? · 6 = 12
20 : ? = 4	24 : ? = 8	? : 3 = 6

2. У збане было 2 л вады, а ў вядры — у 5 разоў больш. Колькі літраў вады было ў вядры?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Даўжыня адной стараны прамавугольніка 4 дм, а даўжыня другой яго стараны ў 3 разы большая. Знайдзі даўжыню другой стараны прамавугольніка. Знайдзі перыметр прамавугольніка.

2. Дашы 18 гадоў. Колькі гадоў брату Дашы, калі ён у 3 разы маладзейшы за яе?

3. Дапоўні ўмову задачы з дапамогай схемы. Рашы задачу.

У Глеба ў тэлефоне запісана … нумароў сяброў. З іх … нумароў — аднакласнікі, … нумароў — сябры з летняга лагера адпачынку, а астатнія сябры жывуць з Глебам у адным доме. Колькі нумароў сяброў з дома запісана ў тэлефоне Глеба?



4. Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

Дзялімае	12	20	27	32	?	?
Дзельнік	?	5	9	?	9	4
Дзель	3	?	?	4	4	6

5. Паменшы лікі ў 4 разы: 8 ; 16 ; 24 ; 20 ; 28 .

Павяліч лікі ў 3 разы: 4 ; 8 ; 3 ; 5 ; 9 .

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Знайдзі заканамернасці. Устаў прапушчаныя лікі.

2 → 4 4 → 8 6 → ? 8 → ? 10 → ?

27 → 9 24 → 8 21 → ? 18 → ? 15 → ?

7. Параўнай значэнні выразаў.

4 · 5 ? 4 · 4 + 4 3 · 7 ? 3 · 9 – 3

4 · 8 ? 4 · 9 – 4 2 · 8 ? 2 · 5 + 2

8. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

37 + ? = 81 ? – 22 = 45 + 19

63 – ? = 49 ? + 51 = 93 – 14

9. Пеця сфатаграфаваў каўпачок зверху. Выберы фатаграфію, якая атрымалася.



1. Вылічы.

14 : 7	24 : 6	7 · 4	21 : 3
4 · 8	2 · 4	12 : 4	36 : 9

2. Даўжыня аднаго адрэзка 18 см, а даўжыня другога адрэзка ў 6 разоў меншая. Знайдзі даўжыню другога адрэзка. Начарці гэты адрэзак.

Спампавана з сайта www.aversev.by



$5 \cdot 9 = 9 \cdot 5$

Растлумач і запомні.

$5 \cdot 5 = 25$
$5 \cdot 6 = 30$
$5 \cdot 7 = 35$
$5 \cdot 8 = 40$
$5 \cdot 9 = 45$

$6 \cdot 5 = 30$
$7 \cdot 5 = 35$
$8 \cdot 5 = 40$
$9 \cdot 5 = 45$

1. Вылічы.

$5 \cdot 7$	$2 \cdot 5$	$4 \cdot 4$	$18 : 3$
$5 \cdot 8$	$4 \cdot 5$	$4 \cdot 8$	$15 : 3$
$9 \cdot 5$	$5 \cdot 5$	$6 \cdot 4$	$14 : 2$

2. Знайдзі значэнні выразаў.

$89 - 20 - 3$	$100 - 20 - 5$	$50 - 40 + 5$
$40 + 21 - 6$	$100 - 37 + 1$	$18 - 9 + 12$

3. Колькі дзён правёў Юрась на канікулах у бабулі, калі ён там быў 5 тыдняў і яшчэ 5 дзён?

4. Сыну 5 гадоў. Тата ў 7 разоў старэйшы за сына і на 2 гады старэйшы за маму. Колькі гадоў маме?

5. Выпішы ў парадку нарастання.

5 см | 5 дм | 20 см | 63 см | 1 м | 1 дм

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. На талерцы 5 персікаў, а сліў — у 3 разы больш. Колькі на талерцы сліў?

7. Параўнай гэту задачу з папярэдняй і рашы яе.
На талерцы 5 персікаў. Гэта ў 3 разы менш, чым сліў. Колькі на талерцы сліў?



Разважай так:
Персікаў у 3 разы менш, чым сліў.
Значыць, сліў у 3 разы больш, чым персікаў.

8. Вася прачытаў 9 старонак кнігі. Гэта ў 5 разоў менш за тое, што прачытаў яго старэйшы брат. Колькі старонак прачытаў старэйшы брат?

Прылічвай па пяць ад ліку пяць да ліку пяцьдзясят.

1. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

9 · ? = 45	5 · ? = 35	20 : ? = 5
? · 6 = 30	? · 8 = 40	? : 5 = 3

2. У сям'і тры браты. Паўлу 5 гадоў. Мікіта на 4 гады старэйшы за Паўла. Валодзя ў 3 разы маладзейшы за Мікіту. Колькі гадоў Валодзю?

Спампавана з сайта www.aversev.by



$5 \cdot 6 = 30$

$30 : 5 = ?$

$30 : 6 = ?$

Растлумач і запомні.

$5 \cdot 5 = 25$
$5 \cdot 6 = 30$
$5 \cdot 7 = 35$
$5 \cdot 8 = 40$
$5 \cdot 9 = 45$

$25 : 5 = 5$
$30 : 5 = 6$
$35 : 5 = 7$
$40 : 5 = 8$
$45 : 5 = 9$

$30 : 6 = 5$
$35 : 7 = 5$
$40 : 8 = 5$
$45 : 9 = 5$

1. Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

Дзялімае	45	35	?	25	40	?
Дзельнік	?	7	5	?	8	4
Дзель	9	?	6	5	?	5

2. Знайдзі значэнні выразаў.

$40 : 5 + 8$ $\quad$ $30 : 6 - 5$ $\quad$ $36 : 4 \cdot 5$

$45 : 5 + 9$ $\quad$ $25 : 5 + 5$ $\quad$ $32 : 8 \cdot 5$

3. У адным наборы 6 фламастараў. Гэта ў 5 разоў менш, чым у другім наборы. Колькі фламастараў у двух наборах?

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Купілі 12 табурэтак, а крэсел — у 3 разы менш. Колькі купілі крэсел?

5. Параўнай гэту задачу з папярэдняй і рашы яе.
Купілі 12 табурэтак. Табурэтак купілі ў 3 разы больш, чым крэсел. Колькі купілі крэсел?



Разважай так:
Табурэтак у 3 разы больш, чым крэсел.
Значыць, крэсел у 3 разы менш, чым табурэтак.

6. Дзіма рашыў задачу за 8 мін. Ён патраціў у 2 разы больш часу, чым Міша. Колькі мінут спатрэбілася Мішу, каб рашыць задачу?

7. На гадзінніку паказана, а якой гадзіне Пеця прыйшоў дадому. Праз 45 мін ён скончыў абедаць. А якой гадзіне Пеця скончыў абедаць?



Адлічвай па пяць, пачынаючы ад ліку пяцьдзясят.

1. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

- Паменшы лікі ў 5 разоў: 30 ; 40 ; 20 .
- Павяліч лікі ў 4 разы: 5 ; 7 ; 9 .

2. На будоўлю прыехала 8 машын з цэглай. Іх было ў 5 разоў менш, чым машын з блокамі. Колькі машын з блокамі прыехала на будоўлю?

Спампавана з сайта www.aversev.by



$6 \cdot 8 = 48$
$8 \cdot 6 = ?$
$48 : 6 = ?$
$48 : 8 = ?$

Растлумач і запомні.

$6 \cdot 6 = 36$
$6 \cdot 7 = 42$
$6 \cdot 8 = 48$
$6 \cdot 9 = 54$

$7 \cdot 6 = 42$
$8 \cdot 6 = 48$
$9 \cdot 6 = 54$

$36 : 6 = 6$
$42 : 6 = 7$
$48 : 6 = 8$
$54 : 6 = 9$

$42 : 7 = 6$
$48 : 8 = 6$
$54 : 9 = 6$

1. Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

Множнік	7	?	6	?	6	5
Множнік	6	8	?	6	4	?
Здабытак	?	48	54	36	?	30

2. Вылічы.

6 см · 7 9 см · 5 5 см · 6 + 33 см

3. Устаў знакі «+» або «–», каб роўнасці былі правільныя.

53 ? 22 ? 18 = 57 61 ? 11 ? 50 = 100

4. Выразі ў мінутах.

1 г 25 мін | 1 г 39 мін | 1 г 12 мін | 1 г 8 мін

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Кішэней на адной сукенцы	Колькасць сукенак	Кішэней на ўсіх сукенках
4	6	?

6. Купілі 40 білетаў у цырк для двух класаў. У адным класе 20 вучняў, што на 3 вучні больш, чым у другім класе. Ці хопіць набытых білетаў для двух класаў?

7. Майстар робіць за змену 54 дэталі, што ў 6 разоў больш, чым робіць вучань. Колькі дэталей яны робяць за змену разам?

8. Рома і Лёша — браты. Рома сказаў, што ў яго дзве сястры, і Лёша сказаў, што ў яго дзве сястры. Колькі дзяцей у сям'і Ромы і Лёшы?

Знайдзі заканамернасць і прадоўжы называць лікі.

60 54 48 ? ? ?

1. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

7 · ? = 42 6 · ? = 48 9 · ? = 54

? : 5 = 8 36 : ? = 6 45 : ? = 5

2. Міця зняў відэакліп пра Мухтара, які доўжыўся 15 мін. Гэта ў 3 разы больш, чым відэакліп пра Мурку. Колькі мінут доўжыўся відэакліп пра Мурку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

На арэне цырка 6 тыграў і 2 львы. У колькі разоў тыграў больш, чым ільвоў? У колькі разоў ільвоў менш, чым тыграў?



Тыграў — 6
Ільвоў — 2
} у колькі разоў?



Каб даведацца, у колькі разоў адзін лік большы або меншы за другі, трэба большы лік падзяліць на меншы.

1. Даўжыня агарода прамавугольнай формы 9 м, а яго шырыня — 3 м. У колькі разоў даўжыня агарода большая за яго шырыню?

2. Састаў і знайдзі дзель двух лікаў. У колькі разоў адзін лік большы або меншы за другі?

3. Знайдзі прапушчаныя лікі. Састаў і прачытай роўнасці.



Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Устаў прапушчаныя лічбы, каб роўнасці былі правільныя.

$$\begin{array}{r} 2* \\ +\ *3 \\ \hline 41 \end{array} \qquad \begin{array}{r} *7 \\ +\ 5* \\ \hline 72 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 7* \\ -\ *2 \\ \hline 39 \end{array} \qquad \begin{array}{r} *4 \\ -\ 5* \\ \hline 18 \end{array}$$

5. Выкарыстоўваючы лікі ад 2 да 9, састаў усе правільныя няроўнасці.

$6 \cdot ? < 36 \qquad ? \cdot 5 > 25 \qquad 24 > 4 \cdot ?$

6. Жэня вучыць англійскую мову. Кожны дзень ён звычайна запамінае 5 новых слоў. Колькі слоў Жэня можа запомніць за тыдзень?

7. Рашы задачу, выкарыстоўваючы даныя і адказ задачы 6.

Жэня ў панядзелак, аўторак і чацвер запамінаў на 2 словы больш, а ў астатнія дні тыдня — на 2 словы менш, чым звычайна. Больш або менш слоў ён вывучыў за гэты тыдзень? На колькі больш або менш?

У колькі разоў 45 больш за 9?
У колькі разоў 4 менш за 32?

1. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Дзель лікаў 18 і 3.
- Здабытак лікаў 6 і 6.
- Здабытак лікаў 6 і 4.

2. У кожнай легкавой машыны 4 колы і адно запасное кола. Колькі ўсяго колаў у 9 машын?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад лікаў.

54	48	42	36	?	?	?	?	?
5	10	15	20	?	?	?	?	?

2. Які з трох лікаў з'яўляецца здабыткам двух іншых? Якія два лікі з трох — дзеллю? Састаў роўнасці.

3. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

? – 25 = 42 : 7 54 : 9 = 36 – ?

? + 12 = 6 · 4 8 · 5 = 30 + ?

4. У куску было 47 м тканіны. З 20 м гэтай тканіны пашылі сукенкі, а з астатняй тканіны — 9 аднолькавых кашуль. Колькі метраў тканіны пайшло на кожную кашулю?

5. Кожныя паўгадзіны на будоўлю прывозяць 6 машын пяску. Колькі машын пяску прывязуць на будоўлю за 2 гадзіны?

Паўгадзіны — гэта палавіна гадзіны.
Падумай, колькі ў адной гадзіне палавін гадзіны.



Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Растлумач, што абазначаюць выразы. Якія запісы лішнія?
У кошыку 12 баравікоў, 24 падасінавікі, рыжыкаў у 4 разы менш, чым падасінавікаў, а падбярозавікаў на 4 менш, чым баравікоў.

12 + 24 | 24 : 4 | 12 + 4 | 12 – 4 | 12 : 4 | 24 – 12 | 24 : 12

7. Маса казляняці 15 кг, а маса парасяці 3 кг. У колькі разоў парася лягчэйшае за казляня? У колькі разоў казляня цяжэйшае за парася?

8. Па календары даведайся, колькі дзён у летніх месяцах. Рашы задачу.
Летам было 68 сонечных дзён. Колькі было нясонечных дзён?

9. Складзі і рашы задачы.





1. Вылічы.
6 см · 9 8 дм · 6 36 кг : 6 42 л : 7

2. У бочку налілі 35 л вады, а ў вядро — 7 л. У колькі разоў больш літраў вады налілі ў бочку, чым у вядро?

Спампавана з сайта www.aversev.by



$7 \cdot 9 = 63$
$9 \cdot 7 = ?$
$63 : 7 = ?$
$63 : 9 = ?$

Растлумач і запомні.

$7 \cdot 7 = 49$
$7 \cdot 8 = 56$
$7 \cdot 9 = 63$

$8 \cdot 7 = 56$
$9 \cdot 7 = 63$

$49 : 7 = 7$
$56 : 7 = 8$
$63 : 7 = 9$

$56 : 8 = 7$
$63 : 9 = 7$

1. Вылічы.

$42 : 6 \cdot 9$	$27 : 3 \cdot 7$	$3 \cdot 8 : 6$
$32 : 4 \cdot 7$	$56 : 8 \cdot 7$	$9 \cdot 4 : 6$

2. Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад лікаў.

63	56	49	42	?	?	?	?	?
6	12	18	24	?	?	?	?	?

3. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Дзель лікаў 49 і 7 павялічыць у 5 разоў.
- Здабытак лікаў 6 і 4 паменшыць у 8 разоў.
- Здабытак лікаў 3 і 6 паменшыць у 9 разоў.
- Дзель лікаў 63 і 7 павялічыць у 6 разоў.

4. Вылічы.

$(19 + 41) + 3$	$61 - (42 - 17)$	$80 - (25 + 36)$

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. У Таніных кара́лях 7 чырвоных пацерачак. Гэта ў 7 разоў менш, чым жоўтых. Колькі жоўтых пацерачак у каралях? Колькі ўсяго пацерачак?

6. Складзі задачы, якія рашаюцца так:

3 + 9 | 3 · 9 | 9 – 3 | 9 : 3

7. Знайдзі фігуры, перыметры якіх роўныя 8 см. Назаві гэтыя фігуры.



8. Купілі 8 чайных сервізаў па 6 кубкаў у кожным і яшчэ адзін сервіз з 12 кубкамі. Колькі ўсяго кубкаў купілі?

Прылічвай па сем, пачынаючы ад ліку сем, да ліку семдзесят.

1. Параўнай.

2 · 7 ? 3 · 7 | 49 : 7 ? 42 : 7

7 · 9 ? 7 · 7 | 56 : 7 ? 45 : 5

2. Даўжыня адрэзка 8 см. Даўжыня гэтага адрэзка на 48 см меншая, чым даўжыня ломанай. У колькі разоў адрэзак карацейшы за ломаную?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Растлумач і запомні.

8 · 8 = 64
8 · 9 = 72

9 · 8 = 72

64 : 8 = 8
72 : 8 = 9

72 : 9 = 8

9 · 9 = 81

81 : 9 = 9

1. Састаў і прачытай роўнасці.



2.
- У колькі разоў здабытак лікаў 3 і 8 большы за дзель лікаў 36 і 6?
- На колькі здабытак лікаў 3 і 8 большы за дзель лікаў 36 і 6?
- У колькі разоў рознасць лікаў 45 і 40 меншая за суму лікаў 13 і 12?
- На колькі рознасць лікаў 45 і 40 меншая за суму лікаў 13 і 12?

3. Вылічы і выканай праверку.

63 – 29	28 + 69	31 + 69	100 – 48
91 – 33	58 + 24	90 – 27	52 + 19

4. Ці хопіць агароджы даўжынёй 40 м для ўчастка квадратнай формы з даўжынёй стараны 80 дм?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Каб добра адпачыць, чалавек павінен спаць ноччу не менш за 8 гадзін. Колькі гадзін трэба праспаць чалавеку за 8 начэй?

6. Няхай Алег заснуў у 22 г 10 мін і праспаў 8 гадзін. На якім гадзінніку паказана, а якой гадзіне Алег заснуў? На якім — калі прачнуўся?



7. Купілі 30 кг сухога корму для сабакі і кошкі. Праз месяц засталося 12 кг корму для сабакі і 7 кг корму для кошкі. Колькі кілаграмаў сухога корму з'елі сабака і кошка за месяц?

Прылічвай па восем, пачынаючы ад ліку восем, да ліку восемдзесят.
Адлічвай па дзевяць, пачынаючы ад ліку дзевяноста.

1. Вылічы.

$4 \cdot 2 \cdot 9$ $3 \cdot 3 \cdot 9$ $8 \cdot 8 + 36$

2. Будаўнікі працавалі на адной будоўлі 9 дзён. Гэта ў 7 разоў менш за той час, што яны працавалі на другой будоўлі. Колькі дзён працавалі будаўнікі на дзвюх будоўлях?

Спампавана з сайта www.aversev.by

25 + ?	25 + a	a, b, c — лацінскія літары
64 : ?	64 : b	a — чытаем «а»
? – 8	c – 8	b — чытаем «бэ»
		c — чытаем «цэ»

Выразы, у якіх ёсць літары, называюць літарнымі выразамі.

Літару можна замяняць рознымі лікамі і знаходзіць значэнні выразаў.

Літару ў выразе называюць **зменнай**.

1. Прачытай выразы. Знайдзі значэнні выразаў, калі a = 20, b = 25. Запішы па ўзоры.

a + 20
20 + 20 = 40

a – 20 b + 75 a + b
a + 79 b – 0 b – a

2. Замяні зменныя лікамі так, каб значэнне кожнага выразу было роўнае 6.

a – 24 46 – c 18 : b a · 3

3. Растлумач, што абазначаюць выразы.
У першай каробцы 12 алоўкаў, у другой каробцы a алоўкаў, а ў трэцяй — b алоўкаў.

12 + a b – a 12 + a + b a + b 12 : b

4. Папугай можа вывучыць 2 словы за адзін дзень. Яго вучылі 5 дзён, а потым папугай вывучыў яшчэ 5 слоў. Колькі ўсяго слоў вывучыў папугай?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Замяні ў задачы літары лікамі з табліцы. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.
Швачка за адну гадзіну можа пашыць a навалачак. Колькі навалачак можа пашыць швачка за b гадзін працы?

Навалачак за 1 гадзіну (шт.)	Час працы (г)	Усяго навалачак (шт.)
6	8	?

6. Вылічы.

72 : 8 · 7	42 : 7 + 78	86 – (39 + 45)
48 : 6 · 8	35 : 5 + 85	95 – (23 – 13)
56 : 8 · 7	81 : 9 – 8	(91 – 77) + 45

7. Начарці ў сшытку такія фігуры. Параўнай іх перыметры.



Прачытай выразы. Знайдзі іх значэнні, калі $a = 3$, $b = 8$, $c = 0$.

$5 \cdot a$ $\quad$ $64 : b$ $\quad$ $74 - c$

1. Вылічы.

7 · 9 + 37	49 : 7 + 56	8 · 9 – 58

2. Турысты пайшлі ў паход. Пры пераправе праз раку 12 чалавек паплылі на катары, а астатнія — на дзвюх лодках па 8 чалавек у кожнай. Колькі было турыстаў?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Прачытай некалькі лацінскіх літар.
Якія з іх ты ведаеш?

A a	*B b*	*C c*	*D d*	*K k*	*L l*	*M m*	*N n*	*O o*	*P p*
а	бэ	цэ	дэ	ка	эль	эм	эн	о	пэ

адрэзак *AB*

прамая *CD*

вугал *LKM*



ломаная *MNOP*



трохвугольнік *ABC*

1. Назаві фігуры.







2. У ломанай *KLMN* кожнае звяно мае даўжыню 23 см. Знайдзі даўжыню гэтай ломанай.

3. Знайдзі значэнні выразаў.

24 : 3 · 7	6 · 7 + 49	(100 – 66) + 9
32 : 8 · 6	7 · 8 – 38	65 – (70 – 53)

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Састаў па табліцы здабыткі. Знайдзі іх значэнні.

a	4	5	6	7	8	9
$a \cdot 9$	?	?	?	?	?	?

5. Для экскурсіі заказалі два мікрааўтобусы па 15 месцаў у кожным і адзін аўтобус на 42 месцы. Колькі чалавек паехала на экскурсію, калі ўсе месцы былі занятыя?

6. Выберы выраз, які з'яўляецца рашэннем задачы. Знайдзі яго значэнне, калі $b = 10$.
Купілі 6 набораў фламастараў па 4 фламастары ў кожным наборы і b алоўкаў. Колькі ўсяго фламастараў і алоўкаў купілі?

$4 \cdot 6$ $\quad$ $4 \cdot 6 + b$ $\quad$ $4 + 6 + b$ $\quad$ $4 \cdot 6 - b$

7. Сума трох лікаў роўная 75. Сума першага і другога роўная 60, а сума першага і трэцяга роўная 39. Знайдзі гэтыя лікі.

Прачытай лацінскія літары: *A, B, C, D, K, L, M, N.*

1. Знайдзі значэнні выразаў.
$7 \cdot 9 + 13$ $\quad$ $40 : 5 + 30$ $\quad$ $48 : 8 + 94$

2. З адной пасекі прывезлі 17 кг мёду, а з другой — 19 кг. Увесь мёд разлілі ў 9 аднолькавых слоікаў. Колькі кілаграмаў мёду атрымалася ў кожным слоіку?

Спампавана з сайта www.aversev.by



Назаві трохвугольнікі, у якіх ёсць прамы вугал; тупы вугал. Назаві трохвугольнікі, у якога ўсе вуглы вострыя.

Трохвугольнік *ABC* — прамавугольны.
Трохвугольнік *KLM* — востравугольны.
Трохвугольнік *NOP* — тупавугольны.

1. Назаві прамавугольны, востравугольны, тупавугольны трохвугольнікі.



2. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

1 м = 2 дм + ? дм
1 м = 3 дм 5 см + ? см
5 дм 4 см = ? см + 2 дм
100 см = 5 дм + ? см
4 дм 7 см = 1 м − ? см
81 см = 9 дм − ? см

Спампавана з сайта www.aversev.by

3. На дзень нараджэння Сярожу падарылі 5 набораў салдацікаў па 2 штукі ў кожным і 4 наборы па 3 штукі ў кожным. Колькі ўсяго салдацікаў падарылі Сярожу?



4. Складзі і рашы задачу.

	Гузікаў на адным вырабе	Колькасць вырабаў	Гузікаў на ўсіх вырабах
I	6	5	?
II	8	7	?

?

5. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

56 + 27 + ? = 86 30 – 22 + ? = 64

69 – 26 + ? = 67 84 – 5 + ? = 100

6. Знайдзі значэнні выразаў $8 + a$ і $8 \cdot a$, калі a роўна 3; 5; 7; 9.

Якія трохвугольнікі называюць прамавугольнымі? Чаму іх так называюць?

1. Знайдзі значэнні выразаў.

74 – 35 59 + 34 65 – 29 93 – 38

2. У майстэрні адрамантавалі 5 камп'ютараў, а планшэтаў — у 3 разы больш. На колькі больш адрамантавалі планшэтаў, чым камп'ютараў?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Калі ў выразе НЯМА ДУЖАК і ён утрымлівае толькі **множанне** і **дзяленне**, то дзеянні выконваюць па парадку злева направа.

① ②
6 : 2 · 5

1. Прачытай і параўнай выразы. Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

36 – 9 + 5	40 + 20 + 20	54 – 9 – 3
36 : 9 · 5	4 · 2 · 2	54 : 9 : 3

2. На колькі адзін лік большы або меншы за другі? У колькі разоў адзін лік большы або меншы за другі?

15 і 3 | 8 і 64 | 81 і 9 | 45 і 9

3. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

38 + ? = 100	4 · ? = 24	? · 5 = 40
? + 14 = 100	48 : ? = 6	? : 9 = 9

4. У першым, другім, трэцім і чацвёртым доме па 9 пад'ездаў. Колькі пад'ездаў у пятым доме, калі ўсяго ў гэтых дамах 46 пад'ездаў?

5. Змяні задачу 4 так, каб адказ атрымаўся большы.

6. Начарці адрэзкі *AB* і *KL* так, каб адзін з іх быў у 2 разы карацейшы за другі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

51 см = 32 см + ? см 92 см = ? см + 24 см

51 см = ? см + 28 см 92 см = 44 см + ? см

51 см = 21 см + ? см 92 см = ? см + 58 см

8. Нарыхтавалі 4 двухлітровыя слоікі з сокам і 6 трохлітровых слоікаў з кампотам. Колькі літраў соку і кампоту нарыхтавалі?

9. Купілі 12 м чырвонай і 20 м жоўтай тасьмы для ўпрыгожвання 9 абрусаў. Ці хопіць гэтай тасьмы, калі на кожны абрус ідзе 4 м тасьмы?

10. Маса адной морквы роўная масе дзвюх радысак. Што лягчэйшае: 4 морквы або 7 радысак?

Вызнач парадак выканання дзеянняў і вылічы.

100 – 99 + 0 72 : 8 · 3

1. Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

2 · 4 · 7 2 · 9 : 6 24 : 6 : 2

2. На пошце прынялі 6 пасылак па 9 кг кожная і 3 пасылкі па 7 кг кожная. Якая маса ўсіх прынятых пасылак?

Спампавана з сайта www.aversev.by



?

4 + 5 · 3



24 – 2 · 4

У выразах БЕЗ ДУЖАК спачатку выконваюць множанне або дзяленне (злева направа), а потым складанне або адніманне (злева направа).

16 – 2 · 5 (2) (1)

18 + 9 : 3 (2) (1)

5 · 2 + 25 (1) (2)

21 : 7 – 3 (1) (2)

8 · 2 + 9 · 4 (1) (3) (2)

100 – 72 : 9 + 4 (2) (1) (3)

1. Прачытай і параўнай выразы. Пакажы парадак выканання дзеянняў. Вылічы.

35 : 5 · 2	20 : 5 · 2	60 + 20 : 4 + 5
35 : 5 + 2	20 – 5 · 2	60 + 20 : 4 · 5

2. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Памяншаемае	54	43	7 · 9	16 : 2
Аднімаемае	3 · 7	64 : 8	2 · 4	72 : 9

3. У кастрычніку ў першыя два тыдні было сонечнае надвор'е, а астатнія дні былі пахмурныя. Колькі пахмурных дзён было ў кастрычніку?

КАСТРЫЧНІК

ПН	2	9	16	23	30
АЎТ	3	10	17	24	31
СР	4	11	18	25	
ЧЦ	5	12	19	26	
ПТ	6	13	20	27	
СБ	7	14	21	28	
НДЗ	1	8	15	22	29

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Разгледзь розныя спосабы запісу рашэння задачы. У школьнай сталовай за 4 столікі селі па 6 вучняў, а за 5 столікаў — па 8 вучняў. Колькі вучняў сядзела за гэтымі столікамі?

1) 6 · 4 = 24 (вуч.)
2) 8 · 5 = 40 (вуч.)
3) 24 + 40 = 64 (вуч.)

6 · 4 + 8 · 5 = 64 (вуч.)

5. З трох кустоў сабралі па 8 бульбін, а з шасці кустоў — па 9 бульбін. Колькі ўсяго бульбін сабралі з гэтых кустоў?

6. Знайдзі значэнні выразу $a : 9$, калі a роўна 63; 54; 45; 36; 27.

7. Выразі ў гадзінах і мінутах.

75 мін | 88 мін | 91 мін | 100 мін

Вызнач парадак выканання дзеянняў і вылічы.

100 – 10 : 5 | 8 : 2 + 10 | 9 · 4 – 48 : 6

1. Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

40 – 6 · 5 | 7 · 8 + 15 | 9 · 6 + 81 : 9

2. Для гасцініцы купілі 3 пакеты пральнага парашку для белай бялізны па 3 кг кожны і 4 пакеты пральнага парашку для каляровай бялізны па 5 кг кожны. Якая маса набытага парашку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

У выразах З ДУЖКАМІ спачатку вылічваюць значэнні выразаў у дужках. Затым выконваюць множанне або дзяленне (злева направа), а потым складанне або адніманне (злева направа).

$40 : (18 - 10)$ (② ①)

$(43 - 38) \cdot 7$ (① ②)

$6 \cdot (2 + 7) - 42$ (② ① ③)

$7 \cdot 8 + (100 - 95)$ (② ③ ①)

1. Прачытай выразы. Вызнач парадак выканання дзеянняў. Вылічы.

$63 : (18 - 9)$	$(54 - 50) \cdot 9$	$42 : 6 \cdot 7$
$49 : (21 - 14)$	$8 \cdot (2 + 5)$	$48 : 8 + 47$
$28 : (16 - 12)$	$(59 + 4) : 9$	$45 : 5 \cdot 4$

2. Прачытай выразы. Вызнач парадак выканання дзеянняў. Вылічы.

$27 + (13 - 3) : 5$	$64 : (72 - 64) + 72$
$(45 - 20) - 48 : 8$	$100 - 36 : (48 : 8)$

3. Параўнай.

$2 \cdot 8 \,?\, 27 - 7$	$48 : 6 \,?\, 48 : 8$
$4 \cdot 9 \,?\, 38 + 2$	$15 : 5 \,?\, 20 : 5$
$3 \cdot 6 \,?\, 38 - 20$	$18 : 3 \,?\, 18 : 9$

4. Састаў выраз, які будзе рашэннем задачы.
Іван кожным ранкам падцягваецца на турніку 5 разоў, а ўвечары — c разоў. Колькі разоў Іван падцягнецца на турніку за тыдзень?

5. Знайдзі адказ задачы 4, калі c роўна 3; 5; 7.

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Растлумач з дапамогай схемы розныя спосабы рашэння задачы. З адной стаянкі паехала 8 машын, а з другой — у 3 разы больш. Колькі ўсяго машын паехала?



1
8 · 3
? + 8
?

2
1 + 3
8 · ?
?

7. Рашы задачу рознымі спосабамі.
Колькі метраў тканіны пайшло на курткі, калі спачатку зрасходавалі 6 м тканіны, а потым у 5 разоў больш метраў тканіны?

8. У першым фотаальбоме на 5 аркушаў больш, чым у другім, а ў трэцім — на 7 аркушаў больш, чым у першым. У якім фотаальбоме аркушаў больш — у другім або ў трэцім, і на колькі аркушаў больш?

Вызнач парадак выканання дзеянняў і вылічы.

10 + 81 : 9	64 : (98 – 90)	3 · (64 – 59) + 15

1. Вызнач парадак выканання дзеянняў. Вылічы.
(65 – 9) : 8 + 93 7 · (18 : 3) – 36

2. У кандытарскім аддзеле было 98 кг цукерак «Рамонак». Калі частку цукерак прадалі, засталося 5 каробак па 7 кг цукерак у кожнай. Колькі кілаграмаў цукерак прадалі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Знайдзі значэнні выразаў.

93 – (46 + 19)	(28 + 33) – 48	68 – (44 – 19)
64 – (72 – 36)	15 + (80 – 36)	(60 + 6) – 47

2. Знайдзі значэнні выразаў.

18 : 6 · 8	3 · 8 : 6	48 : 6 · 4
54 : 6 : 3	2 · 2 · 7	27 : 9 · 4
36 : 6 · 7	42 : 6 · 8	49 : 7 · 2

3. Вылічы.

(34 + 38) : 8	81 : (71 – 62)	52 – 5 · 8
4 · (52 – 44)	(93 – 84) · 5	56 : 8 + 1

4. Вызнач парадак выканання дзеянняў. Вылічы.

18 : 3 + 54 : 9	(66 – 35) + 4 · 9
6 · 8 – 72 : 9	72 – 72 : (3 · 3)

5. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

- Рознасць лікаў 60 і 30 паменшыць у 6 разоў.
- Здабытак лікаў 8 і 7 паменшыць на 47.
- Дзель лікаў 49 і 7 павялічыць у 9 разоў.
- Лік 27 павялічыць на дзель лікаў 36 і 6.

6. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

a	39	51	63	24	45
37 + a	?	?	?	?	?
100 – a	?	?	?	?	?

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

7 · 8 – ? = 8	20 + 18 – ? = 8
45 : 9 + ? = 30	85 – 80 + ? = 72
6 · 6 + ? = 42	92 – 72 + ? = 55

8. Запішы ў слупок. Вылічы і выканай праверку.

47 – 9	100 – 47	27 + 19	58 + 24
56 – 39	83 – 59	24 + 76	9 + 72

9. Устаў прапушчаныя лікі, каб няроўнасці былі правільныя. Колькі такіх лікаў?

? + 16 < 2 · 9	? – 1 < 27 : 9
9 – ? > 3 · 2	6 · 3 – ? > 8 · 2

10. Параўнай.

2 см · 8 ? 27 см – 7 см	48 дм : 6 ? 48 дм : 8
4 кг · 9 ? 38 кг + 2 кг	15 м : 5 ? 20 м : 5
3 л · 6 ? 56 л – 38 л	18 мін : 3 ? 18 мін : 9

11. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.



Спампавана з сайта www.aversev.by

12. Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Зрабіў дэталей за 1 гадзіну (шт.)	Час працы (г)	Усяго зрабіў дэталей (шт.)
?	6	48

13. У першы дзень адрамантавалі 4 м паркавай дарожкі, а ў другі дзень — у 3 разы больш. Колькі метраў паркавай дарожкі адрамантавалі за два дні?

14. Свеце 18 гадоў. Яна ў 2 разы старэйшая за свайго брата. На колькі гадоў брат маладзейшы за Свету?

15. У стосе было 27 сшыткаў. Шэсць вучняў узялі па 4 сшыткі. Колькі сшыткаў засталося ў стосе?

16. Растлумач, што абазначаюць выразы.
Пеця з'ехаў з гары на лыжах a разоў, на снаўбордзе — b разоў і на санках — 7 разоў.



$a + b$ $\quad$ $a + b + 7$

$b : 7$ $\quad$ $b - 7$

Рашы задачу, калі $a = 15$, $b = 14$.

17. Складзі і рашы задачы.





Спампавана з сайта www.aversev.by

18. У кветкавым магазіне зрабілі 9 букетаў з руж па 7 штук у кожным і 6 букетаў гваздзікоў па 5 штук у кожным. Колькі ўсяго кветак было ў гэтых букетах?

19. Для вышывання першага ўзору трэба 32 м нітак, для другога — у 4 разы менш. Ці хопіць для вышывання гэтых узораў дзевяці шпулек, калі ў кожнай з іх па 5 м нітак?

20. Каб прыехаць на дачу, сям'я едзе па горадзе 15 мін і столькі ж мінут едзе за горадам да дачы. Па дарозе на дачу сям'я заехала ў супермаркет і правяла там 30 мін. Колькі часу спатрэбілася сям'і, каб даехаць да дачы?

21. Сям'я выехала на дачу ў 18 г. Які з гадзіннікаў паказвае, а якой гадзіне сям'я выехала на дачу? Прыехала на дачу?



22. Начарці ломаную *MNOP*, даўжыня першага звяна якой 2 см, што на 3 см менш за даўжыню другога звяна. Трэцяе звяно ломанай роўнае суме даўжынь першага і другога звёнаў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

У 7 аднолькавых пакетах 14 л соку.
Колькі літраў соку ў 2 такіх пакетах?

Спачатку даведаемся, колькі літраў соку ў адным пакеце.

Потым даведаемся, колькі літраў соку ў двух пакетах.



1. На 4 сукенкі зрасходавалі 12 м тканіны пароўну на кожную. Колькі метраў тканіны зрасходуюць на 6 такіх жа сукенак?

Расход тканіны на 1 сукенку (м)	Колькасць сукенак (шт.)	Агульны расход тканіны (м)
аднолькавы	4	12
	6	?

Што даведаемся спачатку?



Што даведаемся потым?



Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Знайдзі значэнні выразаў.

(24 + 48) : 9 · 7 63 : (52 – 45) · 4

27 : 3 · (48 – 39) 8 · 7 + 6 · 4

3. Знайдзі значэнні выразаў, калі $a = 4$.

$a \cdot 6 : 3$ $24 : a + 3$ $62 - a + 42$ $21 + (12 - a)$

4. Рашы задачу рознымі спосабамі.

На адным узроўні паркінга 8 свабодных месцаў, а на другім — у 4 разы больш. Колькі свабодных месцаў у паркінгу на гэтых узроўнях?

5. Начарці ломаную, даўжыня якой вылічваецца так: 3 · 2 + 4 + 1.

6. Валера жыве ў дзевяціпавярховым доме. На кожным паверсе па 4 кватэры. У якім пад'ездзе і на якім паверсе жыве Валера, калі нумар яго кватэры 86?

Колькі яек у трох упакоўках, калі ў дзвюх такіх упакоўках 12 яек?

1. Знайдзі значэнні выразаў.

7 · 5 – 12 3 · 9 + 9 · 4 (23 – 19) · 8

2. На спаборніцтвах 25 хлопчыкаў і 29 дзяўчынак падзяліліся на каманды па 6 чалавек. Колькі каманд атрымалася?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Замяні сумы здабыткамі.
Знайдзі значэнні выразаў.

1 + 1 + 1 1 + 1 1 + 1 + 1 + 1 + 1 + 1

Пры множанні 1 на лік атрымліваецца лік, на які множылі.

$1 \cdot a = a$

Пры множанні ліку на 1 атрымліваецца лік, які множылі.

$a \cdot 1 = a$

1. Знайдзі значэнні выразаў.

1 · 4 (9 + 34) · 1 45 : 9 · 1
4 · 1 1 · (100 – 1) 1 · 49 : 7

2. Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

c	3	5	6	8	1
$32 + c \cdot 4$	?	?	?	?	?
$6 \cdot c - 6$	?	?	?	?	?

3. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

64 − 20 − ? = 12 34 + 58 − ? = 29
18 + 46 + ? = 100 96 − 27 + ? = 88

4. У ба́ку было 80 л вады. Спачатку зрасходавалі 12 л, а потым узялі яшчэ 3 васьмілітровыя вядры вады. Колькі літраў вады засталося ў баку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. У трох аднолькавых наборах было 27 гуашавых фарбаў. Колькі гуашавых фарбаў у пяці такіх наборах?

6. Растлумач, што абазначаюць выразы.
Павел загрузіў з інтэрнэту 8 песень, Вадзім — у a разоў больш песень, чым Павел, а Стас — b песень.

$8 \cdot a$ $\quad$ $8 + b$ $\quad$ $8 \cdot a + b$ $\quad$ $8 \cdot a + 8 + b$

7. Устаў прапушчаныя лічбы, каб роўнасці былі правільныя.

$$\begin{array}{r} 5* \\ +\ *9 \\ \hline 83 \end{array} \qquad \begin{array}{r} *4 \\ +\ 4* \\ \hline 100 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 4* \\ -\ *5 \\ \hline 28 \end{array} \qquad \begin{array}{r} *7 \\ -\ 3* \\ \hline 29 \end{array}$$

8. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

1 м = 2 дм + ? дм
1 м = 3 дм 5 см + ? см
5 дм 4 см = ? см + 2 дм
100 см = 5 дм + ? см
4 дм 7 см = 1 м − ? см
81 см = 9 дм − ? см

9. Перыметр квадрата *ABCD* роўны 1 дм 6 см. Знайдзі перыметр квадрата *KLMN*, калі яго старана на 5 см большая за даўжыню стараны квадрата *ABCD*.

Які лік атрымаецца, калі 1 памножыць на 84?
Калі 37 памножыць на 1?

1. Знайдзі значэнні выразаў.
$(64 - 48) \cdot 1$ $\quad$ $6 \cdot 3 \cdot 1$ $\quad$ $100 - 1 \cdot 27 : 9$

2. У сямі аднолькавых кнігах 28 малюнкаў. Колькі малюнкаў у трох такіх кнігах?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Замяні сумы здабыткамі.
Знайдзі значэнні выразаў.

0 + 0 0 + 0 + 0 + 0 0 + 0 + 0 + 0 + 0 + 0

Пры множанні 0 на лік атрымліваецца 0.

$0 \cdot b = 0$

Пры множанні ліку на 0 атрымліваецца 0.

$b \cdot 0 = 0$

1. Знайдзі значэнні выразаў.

0 · 9	15 · (0 + 1)	13 · 0 + 99
7 · 0	(100 – 85) · 0	0 · (68 – 22)

2. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Складаемае	1 · 6	2 · 9	72 : 9	42 : 6
Складаемае	5 · 7	40 : 8	2 · 1	36 : 9

3. Выразі ў мінутах.

1 г 6 мін 1 г 29 мін 1 г 36 мін 1 г 40 мін

Выразі ў гадзінах і мінутах.

75 мін 82 мін 64 мін 93 мін

4. За шэсць дзён у сталовай зрасходавалі 48 кг цыбулі пароўну кожны дзень. Колькі кілаграмаў цыбулі было зрасходавана за тры дні?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Даўжыня адной дарожкі 9 м, а даўжыня другой дарожкі ў 3 разы большая. Ці хопіць 40 м бардзюрнай пліткі для рамонту дзвюх гэтых дарожак, калі гэту плітку трэба класці з абодвух бакоў кожнай дарожкі?



6. Складзі і рашы задачы.



7. Начарці ломаную *ABCD*, у якой даўжыня першага звяна 3 см, даўжыня другога звяна ў 2 разы большая за даўжыню першага, а даўжыня трэцяга — 2 см.

8. Колькі маленькіх жоўтых кубікаў трэба ўзяць Дзянісу, каб скласці адзін вялікі зялёны кубік?



Які лік атрымаецца, калі 0 павялічыць у 100 разоў? Чаму будзе роўны здабытак лікаў 50 і 0?

1. Вылічы.

$15 \cdot 0 + 13$ $\quad$ $84 - 0 \cdot 84$ $\quad$ $100 - 6 \cdot 9 + 54$

2. У магазіне прадалі 5 упаковак з ёгуртам па 8 бутэлечак у кожнай і столькі ж упаковак з ёгуртам па 4 бутэлечкі ў кожнай. Колькі ўсяго бутэлечак з ёгуртам было прададзена?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Знайдзі значэнні выразаў. Растлумач.

1 · 8 = 8	1 · 15 = 15
8 : 1 = ?	15 : 1 = ?
8 : 8 = ?	15 : 15 = ?

Пры дзяленні ліку на 1 атрымліваецца лік, які дзялілі.

$a : 1 = a$

Пры дзяленні ліку на гэты ж лік атрымліваецца 1.

$a : a = 1$

1. Знайдзі значэнні выразаў.

4 · 1	29 · 1	6 · 1 : 1
4 : 4	29 : 1	9 : 1 · 1
4 : 1	29 : 29	7 : 1 · 0

2. Кожны з лікаў 8, 16, 24, 32, 36 паменшы ў 4 разы, а вынік павяліч на 50. Састаў роўнасці.

3. Запішы ў слупок. Вылічы.

79 – 16 7 + 36 81 – 28 31 + 54 + 9

4. У каробцы 6 радоў цукерак па 5 цукерак у кожным радзе. Колькі цукерак будзе ў каробцы, калі:

1) узяць усе цукеркі з аднаго рада;
2) колькасць радоў паменшыць на 3;
3) з кожнага рада ўзяць 1 цукерку;
4) з кожнага рада ўзяць 4 цукеркі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Для дзіцячага свята ў зале расставілі 30 крэсел у 5 радоў пароўну ў кожны. Потым у апошні рад паставілі яшчэ 2 крэслы. Колькі крэсел стала ў апошнім радзе? Колькі крэсел стала ва ўсіх радах?

6. На 4 аднолькавыя стужкі для гімнастак пайшло 20 м атласнай тканіны. Колькі метраў атласнай тканіны пойдзе на 8 такіх стужак?

7. Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.



8. Ці можна з некалькіх аднолькавых жоўтых фігур скласці такія блакітныя фігуры?



Чаму роўная дзель лікаў 99 і 1?
Дзель лікаў 100 і 100?

1. Знайдзі значэнні выразаў.

54 : (9 : 1) 3 · 7 · 0 80 : 80 + (21 + 7)

2. Было 8 кг грэчкі, а рысу — у 3 разы больш. Грэчку і рыс рассыпалі ў пакеты па 4 кг. Колькі ўсяго пакетаў з грэчкай і рысам атрымалася?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Знайдзі значэнні выразаў. Растлумач.

$0 \cdot 6 = 0$	$0 \cdot 9 = 0$	$0 \cdot 15 = 0$
$0 : 6 = 0$	$0 : 9 = ?$	$0 : 15 = ?$

Каб падзяліць 0 на 6, трэба знайсці лік, які пры множанні на 6 дасць 0. Такі лік толькі адзін — гэта 0.

Пры дзяленні ліку 0 на іншы лік атрымаецца 0.

$0 : a = 0$

1. Знайдзі значэнні выразаў.

$25 \cdot 0$	$1 \cdot 10$	$0 : 27$	$1 \cdot 8 \cdot 6$
$0 \cdot 44$	$19 \cdot 1$	$0 : 35$	$49 : 7 : 1$

Дзяліць на 0 нельга!

~~$a : 0$~~

2. Выберы выраз, у якім нельга знайсці значэнне. Растлумач.

$15 + 0 : 4 + 80$ $\qquad$ $29 : (10 - 2 \cdot 5)$

3. Параўнай.

$15 \; ? \; 15 \cdot 1$	$15 + 1 \; ? \; 1 \cdot 15$
$15 \; ? \; 15 \cdot 0$	$0 \cdot 15 \; ? \; 0 + 15$

4. На колькі сантыметраў павялічыцца перыметр квадрата, калі яго старану павялічыць на 1 см; 2 см; 3 см?

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Састаў правільныя роўнасці і няроўнасці, выкарыстоўваючы выразы:

$5 \cdot 6$ $29 + 1$ $42 - 11$ $6 \cdot 5$

6. Дапоўні ўмову, складзі пытанне і рашы задачу.
На спаборніцтвах двум вучням трэба праплыць па … м. Адзін ужо праплыў … м, а другі праплыў на … м больш.

7. У магазіне было 72 л будаўнічага клею ў васьмілітровых бляшанках. Пяць бляшанак з клеем прадалі. Колькі літраў клею засталося?

8. Выберы схему. Рашы задачу.
Юля вышэйшая за Веру на 6 см. Вера вышэйшая за Надзю на 4 см. Параўнай рост Юлі і Надзі.

1

2

Знайдзі дзель лікаў 0 і 8.

1. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$24 \cdot ? = 24$ $65 \cdot ? = 0$ $? : 10 = 0$

2. У майстэрні было 50 рабочых. Механікаў — 36, слесараў — у 4 разы менш, чым механікаў. Астатнія — электрыкі. Колькі электрыкаў у майстэрні?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Растлумач вылічэнні.

$10 \cdot 3 = 30$
$3 \cdot 10 = 30$
$30 : 10 = 3$
$30 : 3 = 10$



1. Знайдзі значэнні выразаў.

$10 \cdot 5$	$50 : 10$	$10 \cdot 8$	$80 : 10$
$5 \cdot 10$	$50 : 5$	$8 \cdot 10$	$80 : 8$

2. Параўнай.

$14 \cdot 0 \;?\; 14 \cdot 1$ $\qquad$ $30 \cdot 1 \;?\; 30 - 1$
$24 : 24 \;?\; 24 : 1$ $\qquad$ $0 + 12 \;?\; 12 \cdot 0$
$10 \cdot 3 \;?\; 5 \cdot 6$ $\qquad$ $90 : 10 \;?\; 54 : 6$

3. Вылічы.

$87 - 39 + 25$ $\qquad$ $81 : 9 \cdot (80 : 8)$
$87 - (39 + 25)$ $\qquad$ $16 : (20 : 10) \cdot 7$
$87 - 39 - 25$ $\qquad$ $4 \cdot 10 : 8 \cdot 0$

4. Выканай дзеянні. Вынік запішы ў дэцыметрах і сантыметрах.

34 см + 29 см – 16 см $\qquad$ 10 дм – 78 см + 24 см
1 м – 55 см + 18 см $\qquad$ 9 дм – 5 дм – 21 см

5. Знайдзі значэнні выразаў $35 + a$ і $35 - a$, калі a роўна 12; 24; 30; 35.

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Для таго каб звязаць 3 пары аднолькавых рукавічак, бабулі спатрэбілася 12 маткоў пражы. Колькі маткоў пражы пайшло на 2 пары рукавічак?

7. Растлумач, што абазначаюць выразы.
Купілі 5 кароткіх шлангаў даўжынёй па 2 м кожны і 8 доўгіх шлангаў па 5 м кожны.

$5 + 8$ $2 \cdot 5$ $5 - 2$ $5 \cdot 8$ $8 - 5$

8. Складзі пытанне да задачы 7 так, каб яна рашалася трыма дзеяннямі. Запішы рашэнне задачы.

9. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.
Ягор і Лена выйшлі насустрач адно аднаму. Ягор прайшоў да сустрэчы 54 м, а Лена — 32 м. Колькі метраў было паміж імі спачатку?



Павяліч лік 10 у 7 разоў. Паменшы лік 70 у 10 разоў.

1. Знайдзі значэнні выразаў.
$16 : 8 \cdot 10$ $10 \cdot (72 : 9)$ $(24 + 26) : 10 \cdot 1$

2. Старана квадрата *ABCD* мае даўжыню 14 см. Знайдзі перыметр квадрата *LMNO*, калі яго старана на 4 см карацейшая за старану квадрата *ABCD*.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы. Выканай праверку.

54 + 31	48 + 7	45 + 28
51 – 29	72 – 6	67 – 22

2. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

a	49	70	60	18	10	0
b	7	7	10	3	10	5
$a : b$	?	?	?	?	?	?

3. Знайдзі значэнні выразаў.

88 – (72 – 62) · 3	54 : (18 : 2 – 8)
37 + (65 – 15) : 10	36 · (72 : 9 – 7)
69 – (74 – 34) : 4	40 : (9 · 5 – 5)

4. Параўнай.

54 : 9 + 0 : 7 ? 63 : 9 · 0 + 6

49 : 7 – 8 · 0 ? 28 : 4 – 0 · 52

5. У 8 каробках 24 кг зефіру пароўну ў кожнай. Колькі кілаграмаў зефіру ў пяці такіх каробках? На колькі кілаграмаў зефіру больш у васьмі каробках, чым у пяці каробках?

6. У аквапарку на адзін сеанс можна прадаць 100 білетаў. Было прададзена 34 дарослыя білеты, што на 23 білеты менш, чым дзіцячых. Колькі білетаў засталося прадаць?

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Выберы схему. Рашы задачу.
Ад куска шоўку даўжынёй 30 м адрэзалі 8 м тканіны, а ад куска саціну такой жа даўжыні адрэзалі 10 м тканіны. Якой тканіны засталося больш? На колькі метраў больш?





8. З двух многавугольнікаў склалі прамавугольнік. Начарці ў сшытку прамавугольнік, які атрымаўся. Вылічы яго перыметр.



9. Маса грушы роўная масе двух сліў. На адной чашы вагаў груша і сліва. Колькі сліў на другой чашы, калі вагі ў раўнавазе?

1. Устаў знакі, каб роўнасці былі правільныя.

2 ? 1 = 2	0 ? 6 = 6	8 ? 8 = 0
1 ? 1 = 2	7 ? 0 = 0	8 ? 8 = 1

2. На велатрэку каталіся 8 дзяўчынак, а хлопчыкаў — у 2 разы больш. Колькі ўсяго дзяцей каталася на велатрэку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Палавіна, або адна другая частка, шакаладкі.



Трэць, або адна трэцяя частка, шакаладкі.



Чвэрць, або адна чацвёртая частка, шакаладкі.



У запісах віду

$\frac{1}{2}, \frac{1}{3}, \frac{1}{4}, \ldots$

лік, запісаны пад лініяй, абазначае,
на колькі роўных частак падзялілі;
лік, запісаны над лініяй, абазначае,
колькі такіх частак узялі.

1. Якая частка фігуры не зафарбавана?



Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Вылічы.

7 · (56 – 50) : 1	7 · (6 + 4 : 4)
10 · (100 – 91) + 10	64 : (58 + 36 : 6)
(38 + 22) : 6 + 82	80 : (10 + 0 : 14)

3. Расстаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя.

5 + 3 · 8 – 4 = 60	5 + 3 · 8 – 4 = 17

4. Міша схадзіў да калодзежа 6 разоў і кожны раз прыносіў па два вядры вады. Маша схадзіла па ваду 3 разы і насіла па аднаму вядру. Колькі вёдзер вады прынеслі Міша і Маша разам?

5. У запаведніку нарыхтавалі на зіму 10 стагоў сена для падкормкі зуброў, а для падкормкі ласёў — у 3 разы больш стагоў сена. На колькі больш стагоў сена нарыхтавалі для ласёў?

6. Ліза адзначыла на прамой запар 4 пункты на адлегласці 2 см адзін ад аднаго. Якая адлегласць ад першага пункта да апошняга?

Выберы схему, на якой выдзелена адна пятая частка адрэзка.

1

2

1. Знайдзі значэнні выразаў.

8 · 5 : 4 + 11	(77 – 14 : 2) : 7

2. Мультфільм доўжыўся 40 мін, а прагноз надвор'я — у 8 разоў менш. На колькі мінут мультфільм даўжэйшы за прагноз надвор'я?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Разгледзь, як разрэзалі на роўныя часткі тры аднолькавыя пірагі.

Што больш — палова пірага або трэць пірага?
Што менш — чвэрць пірага або палова пірага?
Што больш — трэць пірага або чвэрць пірага?

1. Дапоўні словамі «больш за» або «менш за» запісы так, каб яны былі правільныя.

$\frac{1}{2}$ адрэзка … $\frac{1}{3}$ адрэзка

$\frac{1}{5}$ адрэзка … $\frac{1}{4}$ адрэзка

$\frac{1}{3}$ адрэзка … $\frac{1}{5}$ адрэзка

$\frac{1}{2}$ адрэзка … $\frac{1}{4}$ адрэзка

Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Параўнай.

(52 + 12) : 8 ? 8 95 ? 100 – (90 – 6)

80 – 9 · 6 ? 30 81 ? 72 : 8 · 9

3. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

c	4	1	6	8	10	0
$c \cdot 6 + 29$	?	?	?	?	?	?

4. Вылічы.

3 дм 4 см + 5 дм 3 см 7 дм 6 см + 22 см

4 дм 6 см – 2 дм 1 см 6 дм 9 см – 37 см

5. Арына і Марына ехалі на веласіпедах насустрач адна адной. Арына праехала да сустрэчы 14 км, а Марына — на 2 км менш. Якая адлегласць была паміж дзяўчынкамі спачатку?



6. У пяці хакейных камандах гуляюць 30 хлопчыкаў. Колькі хлопчыкаў гуляе ў сямі такіх камандах?

Што больш — адна другая частка круга або адна чацвёртая частка гэтага ж круга?

1. Знайдзі значэнні выразаў.

(18 · 1 + 32) : 10 7 · (7 · 8 – 46) 28 + 5 · 0

2. Для рамонту кватэры купілі 30 кг фарбы ў 10 аднолькавых бляшанках. Выкарысталі 4 бляшанкі. Колькі кілаграмаў фарбы выкарысталі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Было 6 кубікаў. Узялі $\frac{1}{3}$ частку кубікаў. Колькі кубікаў узялі?



$\frac{1}{3}$ частка кубікаў

Разважай так:
Трэба знайсці адну трэцюю частку ўсіх кубікаў.
Для гэтага 6 падзялю на 3.

1. У класе 24 вучні. Адна чацвёртая частка ўсіх вучняў займаецца тэнісам. Колькі вучняў займаецца тэнісам?



2. На колькі частак падзелены кожны круг? Ці можна для кожнага круга назваць, якая яго частка зафарбавана?

З дапамогай рысунка дапоўні словамі «больш за» або «менш за» запісы так, каб яны былі правільныя.

$\frac{1}{2}$ круга ? $\frac{1}{3}$ круга

$\frac{1}{8}$ круга ? $\frac{1}{4}$ круга

$\frac{1}{4}$ круга ? $\frac{1}{2}$ круга

$\frac{1}{8}$ круга ? $\frac{1}{3}$ круга

3. Знайдзі значэнні выразаў, калі $b = 8$.

$b \cdot 7 - (24 + 24)$ $\quad$ $24 : b + 70 : 7$ $\quad$ $1 \cdot b + 10 \cdot b$

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Выберы пытанне і рашы задачу.
Коля ідзе ад дома да школы 8 мін. Гэта на 16 мін менш, чым час, затрачаны на шлях ад школы да парку.

Колькі мінут трэба затраціць Колю, каб дайсці ад дома да школы і вярнуцца назад?

У колькі разоў больш мінут трэба затраціць на шлях ад школы да парку, чым ад школы да дома?

5. Для пашыву сукенкі расходуюць 3 м тканіны, а для пашыву двух касцюмаў — 8 м. У швачкі ёсць 18 м тканіны. Ці можа яна пашыць з гэтай тканіны 4 сукенкі? 2 сукенкі і 3 касцюмы? 3 сукенкі і 3 касцюмы?

6. Ці правільнае сцвярджэнне, што перыметр пяцівугольніка *ABCDM* роўны адной другой частцы дэцыметра?



Было 8 яблыкаў. З'елі чвэрць яблыкаў. Колькі яблыкаў з'елі?

1. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Памяншаемае	3 · 7	24	19	100
Аднімаемае	15	24 : 8	2 · 6	72 : 8

2. Вучні трэцяга класа зрабілі 6 кармушак для птушак. Гэта на 12 кармушак менш, чым зрабілі чацвёртакласнікі. У колькі разоў больш кармушак зрабілі чацвёртакласнікі за трэцякласнікаў?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Зялёныя кубікі — гэта $\frac{1}{2}$ частка ўсіх кубікаў. Колькі ўсяго кубікаў?

$\frac{1}{2}$ частка кубікаў

Разважай так:

Вядома, што $\frac{1}{2}$ частка кубікаў — гэта 3 кубікі.

Значыць, у дзвюх такіх частках будзе 2 разы па 3 кубікі. Трэба 3 памножыць на 2.

1. Адна пятая частка ўсіх дрэў у садзе — гэта 8 сліў. Колькі ўсяго дрэў у садзе?



2. Выберы схему. Рашы задачу.

У кошыку 5 баравікоў. Гэта $\frac{1}{3}$ частка ўсіх грыбоў у кошыку. Колькі ўсяго грыбоў у кошыку?

1



2



3



4



Спампавана з сайта www.aversev.by

3. У букеце 15 гваздзікоў. Чырвоныя гваздзікі складаюць $\frac{1}{3}$ частку ўсіх гваздзікоў у букеце. Колькі ў букеце чырвоных гваздзікоў?

4. Выпішы правільныя роўнасці.

100 – 80 = 5 · 5	24 + 25 = 7 · 8
24 – (71 – 59) = 3 · 4	81 : 9 = 27 : 3

5. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

2 · ? = 16	3 · ? = 24	? · 6 = 54
30 : ? = 5	27 : ? = 9	? : 3 = 7

6. Шэсць турыстаў плылі на дзвюх лодках 4 дні, потым столькі ж дзён ехалі на веласіпедах. Кожны дзень турысты адпачывалі днём па 2 гадзіны. Колькі гадзін яны затрацілі на дзённы адпачынак за ўвесь паход?

7. Бацьку завуць Аляксандр Пятровіч. Імя па бацьку дзеда — Мацвеевіч. Сына назвалі ў гонар прадзеда. Як завуць сына і як дзеда?

Трэць даўжыні дарожкі — 3 м. Як знайсці даўжыню ўсёй дарожкі?

1. Запішы ў слупок. Вылічы.

29 + 58 47 + 53 71 – 25 100 – 36

2. Вася прабег 80 м, а яго малодшы брат — адну восьмую частку гэтай дыстанцыі. Колькі метраў прабег малодшы брат Васі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Знайдзі $\frac{1}{7}$ частку даўжыні адрэзка, роўнага 14 см; 21 см; 28 см; 35 см.

2. Знайдзі даўжыню адрэзка, калі яго пятая частка роўная 2 см; 4 см; 6 см; 8 см.

3. Начарці ў сшытку адрэзак даўжынёй 12 см. Начарці адзін пад адным адрэзкі, роўныя: $\frac{1}{2}$ гэтага адрэзка; $\frac{1}{3}$ гэтага адрэзка; $\frac{1}{4}$ гэтага адрэзка; $\frac{1}{6}$ гэтага адрэзка.

4. Параўнай даўжыні адрэзкаў з задання 3. Ці правільнае сцвярджэнне, што:
- палова адрэзка меншая за трэць гэтага адрэзка;
- чвэрць адрэзка большая за шостую частку гэтага адрэзка;
- трэць адрэзка большая за палову адрэзка?

5. Параўнай.

$6 \cdot 7$? $80 - 36$
$3 \cdot 8$? $22 + 2$
$5 \cdot 6$? $78 - 28$

18 см : 6 ? 24 см : 8
45 дм : 9 ? 40 дм : 5
27 м : 3 ? 27 м : 9

6. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.





Спампавана з сайта www.aversev.by

7. У супермаркет прывезлі 9 каробак з фісташкавым марожаным. Гэта пятая частка ўсіх каробак з марожаным, якія прывезлі. Колькі каробак з марожаным прывезлі ў супермаркет?

8. Маме 32 гады, дачцэ 8 гадоў. Колькі гадоў будзе маме, калі дачцэ будзе 12 гадоў?

9. Выберы схему. Рашы задачу.
Вышыня бярозы 29 м. Сасна на 12 м вышэйшая за бярозу і на 6 м вышэйшая за дуб. Што вышэйшае — бяроза або дуб? На колькі метраў вышэйшае?

Схема 1			
Схема 2			
Схема 3			

1. Параўнай.
54 : 6 ? 54 : 9 · 7 21 : 7 · (6 : 2) ? 21 : 7 · 6 : 2

2. Пятая частка даўжыні адрэзка *AB* роўная 2 см. Знайдзі даўжыню адрэзка *AB*. Начарці гэты адрэзак.

Спампавана з сайта www.aversev.by



20 · 3 = 2 дзяс. · 3 = 6 дзяс. = 60
60 : 3 = 6 дзяс. : 3 = 2 дзяс. = 20
60 : 20 = 6 дзяс. : 2 дзяс. = 3

1. Вылічы і растлумач.

10 · 4	30 · 2	40 · 2	20 · 4
40 : 4	60 : 2	80 : 2	80 : 4
40 : 10	60 : 30	80 : 40	80 : 20

2. Вылічы па ўзоры.

$\frac{3 \cdot 20 = 60}{20 \cdot 3 = 60}$ 3 · 30 4 · 20 2 · 50

3. Знайдзі значэнне выразу $b + 20 \cdot b - 14$, калі b роўна 1; 2; 3; 4.

4. Вылічы ў слупок. Выканай праверку.
83 – 26 56 + 39 77 – 49 52 + 19

5. Дапоўні задачу данымі з табліцы. Рашы задачу. Афрыканскі слон на 2 м ніжэйшы за жырафу. Ці можа жырафа зазірнуць у акно другога паверха дома, калі яно знаходзіцца на вышыні 50 дм ад зямлі?

Зубр	2 м
Слон	4 м
Страус	2 м 70 см

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. • Знайдзі $\frac{1}{5}$ ад 15 мін; 20 мін; 25 мін; 35 мін.

• Знайдзі $\frac{1}{4}$ ад 20 кг; 32 кг; 36 кг; 40 кг.

7. Дзядулю 64 гады, унучцы 8 гадоў. У колькі разоў унучка маладзейшая за дзядулю? Колькі гадоў будзе дзядулю, калі ўнучцы будзе 14 гадоў?

8. Электрычка адправілася з Мінска ў 17 г 5 мін і прыбыла ў Заслаўе ў 17 г 45 мін. Пятую частку часу электрычка стаяла на станцыях. Колькі часу стаяла электрычка?

9. Якая частка фігуры не зафарбавана?





Растлумач, як 50 памножыць на 2; як 5 памножыць на 20.

1. Вылічы.

30 · 3 – 48	80 : 4 : 5 · 10
2 · 20 + 53	80 : 40 · 10 · 4

2. У святочным прадстаўленні ўдзельнічалі 48 цыркавых артыстаў. Гімнастаў было 28, а акрабатаў і жанглёраў — пароўну. Колькі акрабатаў удзельнічала ў прадстаўленні?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Колькі ўсяго груш? Разгледзь розныя спосабы вылічэння.

Спосаб 1

Колькі груш у адным радзе?

$4 + 2$

Колькі ўсяго груш?

$(4 + 2) \cdot 3$

Спосаб 2

Колькі жоўтых груш?

$4 \cdot 3$

Колькі чырвоных груш?

$2 \cdot 3$

Колькі ўсяго груш?

$4 \cdot 3 + 2 \cdot 3$

$(4 + 2) \cdot 3 = 4 \cdot 3 + 2 \cdot 3$

Размеркавальная ўласцівасць множання

Каб памножыць суму на лік, можна кожнае складаемае памножыць на гэты лік і атрыманыя вынікі скласці.

$(a + b) \cdot c = a \cdot c + b \cdot c$

1. Вылічы рознымі спосабамі.

$(4 + 3) \cdot 5$ $(2 + 5) \cdot 6$ $(3 + 7) \cdot 2$

$(1 + 8) \cdot 7$ $(4 + 1) \cdot 9$ $(4 + 6) \cdot 3$

2. Параўнай.

$7 \cdot 2 + 3 \cdot 2 \;?\; (7 + 3) \cdot 2$ $(5 + 4) \cdot 3 \;?\; 5 \cdot 3 + 4$

$(9 + 0) \cdot 10 \;?\; 10 \cdot 9 + 10$ $2 \cdot 3 + 6 \;?\; (2 + 6) \cdot 3$

Спампавана з сайта www.aversev.by

3. Растлумач, як можна рознымі спосабамі вылічыць перыметр прамавугольніка *ABCD*.

Перыметр фігуры абазначаюць лацінскай літарай *P*.

$P = (3 + 2) \cdot 2 = 10$ (см) $P = 3 \cdot 2 + 2 \cdot 2 = 10$ (см)

4. Знайдзі перыметр прамавугольніка *MNKL* з даўжынямі старон 20 см і 30 см.

5. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Складаемае	40 · 2	36 · 0	60 : 20	100 : 5
Складаемае	80 : 4	90 : 30	63 – 27	100 : 20

6. Маса адной лялькі і адной машынкі разам роўная 5 кг, а маса чатырох такіх лялек і трох машынак — 17 кг. Знайдзі масу адной лялькі і масу адной машынкі.

Знайдзі правільную роўнасць.
$(6 + 3) \cdot 4 = 6 + 3 \cdot 4$ $(6 + 3) \cdot 4 = 6 \cdot 4 + 3 \cdot 4$

1. Знайдзі значэнні выразаў.
$(46 – 6) : 2$ $3 \cdot 20 : 30$ $100 : 50 + (72 – 47)$

2. Для вырабу двух аднолькавых кармушак для птушак спатрэбілася 16 дм дошкі. Колькі дэцыметраў дошкі трэба для вырабу трох такіх кармушак?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Як памножыць двухзначны лік на адназначны?





$$34 \cdot 2 = (30 + 4) \cdot 2 = 30 \cdot 2 + 4 \cdot 2 = 60 + 8 = 68$$

Разважай так:
1. Прадстаўляю двухзначны лік у выглядзе сумы разрадных складаемых.
2. Множу кожнае складаемае на адназначны лік.
3. Атрыманыя вынікі складваю.

1. Знайдзі значэнні выразаў.

22 · 3	2 · 44	15 · 6	9 · 11
25 · 4	7 · 12	17 · 4	5 · 13

2. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.
- Ад сумы лікаў 25 і 46 адняць здабытак лікаў 4 і 12.
- Да здабытку лікаў 32 і 2 дадаць дзель лікаў 60 і 20.
- Здабытак лікаў 50 і 2 паменшыць на здабытак лікаў 4 і 15.
- Дзель лікаў 80 і 4 павялічыць на лік 47.

3. Складзі пытанне і рашы задачу.
Дзясятую частку гадзіны Юра затраціў на тое, каб скапіраваць любімы фільм на свой камп'ютар, а трэцюю частку гадзіны глядзеў гэты фільм.

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Мышка за 4 г занесла ў норку 20 зярнятак. Колькі зярнятак яна можа занесці ў норку за 2 г, калі будзе насіць па столькі ж зярнятак за гадзіну?

5. Вылічы.

45 : 9 · 6 + 1	(10 + 30) · 2 – 80
74 – 36 : 6 – 15	(20 + 40) : 6 + 90

6. Вылічы перыметр прамавугольніка, даўжыня якога 10 см, а шырыня 7 см.

7. Змяні лікі ў задачы 6 так, каб перыметр прамавугольніка павялічыўся на 4 см.

8. Колькі часу? На якім цыферблаце стрэлкі ўтвараюць прамы вугал? Востры вугал? Тупы вугал?



Растлумач, як памножыць 45 на 2.

1. Знайдзі значэнні выразаў.

14 · 5 3 · 16 4 · 22 25 · 2 – 25

2. Вылічы перыметр прамавугольніка, шырыня якога 6 см, а даўжыня 13 см.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Рашы задачу двума спосабамі.
Колькі метраў тканіны патрабуецца, каб пашыць 11 касцюмаў, калі на кожныя штаны ідзе па 2 м тканіны, а на кожны пінжак — па 3 м тканіны?

Спосаб 1



Спосаб 2



2. Рашы задачу двума спосабамі.
У гасцініцы 3 паверхі. На кожным паверсе 12 нумароў класа люкс і 21 нумар класа камфорт. Колькі ўсяго нумароў у гасцініцы?

3. Знайдзі значэнні выразаў.

13 · 4	21 · 2	18 · 5	47 · 2
13 · 5	21 · 3	18 · 4	47 · 1
13 · 6	21 · 4	18 · 3	47 · 0

4. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Памяншаемае	46 · 2	25 · 4	33 · 3	19 · 5
Аднімаемае	24 · 3	15 · 5	22 · 2	12 · 7

5. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

14 кг · 5 + ? кг = 100 кг
23 кг · 4 + ? кг = 100 кг
? дм + 25 дм · 3 = 100 дм
? см + 31 см · 2 = 1 м

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Вылічы. Вынік выразі ў гадзінах і мінутах.
45 мін – 40 мін + 79 мін
70 мін + 20 мін – 8 мін
65 мін – 65 мін + 99 мін
100 мін – 48 мін + 17 мін

7. Раман чытаў па 12 старонак кнігі кожны дзень з панядзелка па пятніцу. Колькі старонак у кнізе, калі ў суботу хлопчык прачытаў 11 старонак, а ў нядзелю — апошнія 10 старонак?

8. Начарці такую ломаную ў сшытку. Злучы пункты A і *K*. Зафарбуй жоўтым колерам $\frac{1}{8}$ частку фігуры, якая атрымалася. Зафарбуй чырвоным колерам $\frac{1}{4}$ частку фігуры *ABCDMK*. Знайдзі перыметр гэтага шасцівугольніка.



Складзі задачы па выразах.

$2 \cdot 6 + 8 \cdot 6$ $(2 + 8) \cdot 6$

1. Вылічы.
$80 : 20 \cdot 16$ $90 : 30 \cdot 27$ $100 : 20 \cdot 18$

2. Пятая частка ўсіх вучняў класа займаецца ў секцыі па плаванні. Колькі дзяцей вучыцца плаваць, калі ў класе 25 вучняў?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы рознымі спосабамі.

$(8 + 40) \cdot 2$ $\qquad$ $30 \cdot 2 + 6 \cdot 2$

$(10 + 8) \cdot 4$ $\qquad$ $20 \cdot 3 + 3 \cdot 3$

2. Параўнай.

$8 \cdot 4 + 8 \cdot 3$? $8 \cdot (4 + 3)$ $\qquad$ $(2 + 10) \cdot 8$? $11 \cdot 8$

$3 \cdot 6 + 5 \cdot 6$? $(3 + 5) \cdot 7$ $\qquad$ $(20 - 1) \cdot 4$? $20 \cdot 4$

3. Знайдзі значэнні выразу $(a + b) \cdot c$, калі:

$a \cdot c$	29	13	0	10
$b \cdot c$	61	45	10	1

4. Вылічы.

$35 \cdot 2$	$12 \cdot 3$	$23 \cdot 4$	$20 \cdot 5$
$36 \cdot 2$	$14 \cdot 3$	$22 \cdot 4$	$18 \cdot 5$
$37 \cdot 2$	$16 \cdot 3$	$21 \cdot 4$	$16 \cdot 5$

5. У актавай зале школы 100 месцаў. Ці хопіць месцаў для ўсіх вучняў, калі ў залу ўвайшлі 3 класы і ў кожным класе было па 13 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак?

6. Што абазначаюць выразы да ўмовы задачы?
Якія выразы не спатрэбяцца для рашэння задачы?
Купілі 5 пакетаў бульбы па 8 кг у кожным пакеце і 3 пакеты морквы па 4 кг у кожным пакеце. Колькі ўсяго кілаграмаў агародніны купілі?

$5 + 3$ $\quad$ $8 \cdot 5$ $\quad$ $4 \cdot 3$ $\quad$ $8 + 4$ $\quad$ $5 - 3$ $\quad$ $8 - 4$

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. У шасці ўпакоўках было 60 музычных дыскаў пароўну ў кожнай. Колькі дыскаў было ў чатырох такіх упакоўках?

8. Прачытай задачу. Ці можна яе рашыць? Калі нельга, то змяні ўмову так, каб задачу можна было рашыць. Тата прынёс для паліванне агарода 10 вёдзер вады, а Мікіта — 20 л вады. Колькі ўсяго літраў вады прынеслі тата і Мікіта?

9. Вызнач, колькі сантыметраў змяшчаецца:
- у палавіне метра; у дзвюх палавінах метра;
- у палавіне дэцыметра; у дзвюх палавінах дэцыметра;
- у чвэрці метра; у чатырох чвэрцях метра.

10. Дзіма, Віця, Сяргей і Сеня занялі першыя чатыры месцы ў спаборніцтвах па бегу. Вызнач, якое месца заняў кожны хлопчык, калі:
- Дзіма не заняў ні першага, ні чацвёртага месца;
- Віця заняў другое месца;
- Сяргей не быў апошні.

1. Вылічы.

$16 \cdot 6 - 3 \cdot 27$ $\qquad$ $(15 + 24 \cdot 3) : 1$

2. Прадалі 12 пакетаў з чырвонай і белай цыбуляй. У кожным пакеце было па 2 кг чырвонай цыбулі і па 3 кг белай цыбулі. Знайдзі масу прададзенай цыбулі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Трое дзяцей хочуць падзяліць пароўну 18 штук ірысу і 12 ледзянцоў. Колькі цукерак атрымае кожны?



Спосаб 1	Спосаб 2
(18 + 12) : 3 = 30 : 3 = 10	18 : 3 + 12 : 3 = 6 + 4 = 10

$$(18 + 12) : 3 = 18 : 3 + 12 : 3$$

Каб падзяліць суму на лік, можна кожнае складаемае падзяліць на гэты лік і атрыманыя вынікі скласці.

$$(a + b) : c = a : c + b : c$$

1. Вылічы рознымі спосабамі.

(8 + 4) : 2 (3 + 6) : 3 (12 + 4) : 2
(8 + 8) : 4 (9 + 9) : 3 (24 + 16) : 4

2. Параўнай.

(4 + 8) : 2 ? 4 : 2 + 8 : 2 15 · 5 + 2 · 5 ? (15 + 2) · 5
12 : 3 + 9 ? (12 + 9) : 3 14 · 3 + 8 · 4 ? (14 + 8) · 3

3. Палавіна перыметра прамавугольніка роўная 16 дм. Знайдзі перыметр гэтага прамавугольніка. Знайдзі даўжыні яго старон, калі адна са старон на 6 дм карацейшая за другую.

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Дапоўні ўмову данымі з табліцы. Рашы задачу.

Даўжыня дэльфіна складае $\frac{1}{9}$ частку даўжыні кіта. Знайдзі даўжыню кіта.

Морж	4 м
Дэльфін	3 м
Цюлень	3 м

5. Выберы схему. Рашы задачу.

У Мілы ў 3 разы больш сліў, чым у Цімы. Калі Міла з'есць 4 слівы, то ў дзяцей сліў стане пароўну. Колькі сліў у Мілы?

1



2



3



Знайдзі правільную роўнасць.

(6 + 4) : 2 = 6 : 2 + 4 (6 + 4) : 2 = 6 : 2 + 4 : 2

1. Знайдзі значэнні выразаў.

(60 + 20) : 2 60 : 3 + 9 : 3 18 · 3 – 27 · 2

2. Сашу падарылі канструктар, у якім было 65 дэталей. Саша зрабіў паравоз з 11 дэталей. З астатніх дэталей Саша зрабіў 9 вагонаў. Колькі дэталей пайшло на вагон, калі на кожны з іх спатрэбілася дэталей пароўну?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Як падзяліць двухзначны лік на адназначны?

1 

36 : 3 = (30 + 6) : 3

2 

36 : 2 = (20 + 16) : 2

Разважай так:
1. Прадстаўляю двухзначны лік у выглядзе сумы зручных складаемых, кожнае з якіх дзеліцца на дзельнік.
2. Дзялю кожнае складаемае на адназначны лік.
3. Атрыманыя вынікі складваю.

1. Вылічы.

48 : 4	55 : 5	63 : 3	84 : 2
57 : 3	64 : 4	72 : 6	96 : 8

2. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.
- Да дзелі лікаў 75 і 5 дадаць здабытак лікаў 3 і 13.
- Ад здабытку лікаў 5 і 20 адняць дзель лікаў 69 і 3.

3. Па якіх прыметах можна падзяліць выразы на дзве групы? Вылічы.

(36 – 19) · 5 | 64 : 8 · 11 | 4 · (17 + 5) + 12

5 · 16 : 40 | (24 – 12) · 2 · 3 | 48 : 6 + 5 · 10

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. За 2 мін з крана выцякае 10 л вады. Колькі літраў вады можа выліцца з крана за 5 мін?

5. Вылічы перыметр квадрата са стараной 5 см. Чаму роўная $\frac{1}{4}$ частка перыметра гэтага квадрата? $\frac{1}{2}$ частка?

6. Знайдзі значэнні выразаў, калі $a = 4$.

$(a + 7) \cdot 3$ $\qquad$ $2 \cdot 9 + 2 \cdot a$

$(9 + a) \cdot 3$ $\qquad$ $a \cdot 3 + 7 \cdot 3$

7. Шостую частку ўсіх дзён лістапада свяціла сонца, а астатнія дні былі пахмурныя. Якіх дзён у лістападзе было больш — пахмурных або сонечных? На колькі больш?

8. Выкажы здагадку, які з чырвоных адрэзкаў даўжэйшы. Правер з дапамогай вымярэнняў.





Растлумач, як падзяліць 39 на 3; 48 на 3.

1. Вылічы.

24 : 2 $\qquad$ 66 : 6 $\qquad$ 96 : 6 $\qquad$ 75 : 5

2. Прывезлі 64 кг фруктаў. Да абеду прадалі чацвёртую частку фруктаў. Колькі кілаграмаў фруктаў засталося?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Рашы задачу двума спосабамі.
У адзін акварыум трэба ўліць 24 л вады; а ў другі — 36 л. Колькі шасцілітровых вёдзер вады трэба ўліць у абодва акварыумы.

Спосаб 1



Спосаб 2



2. Рашы задачу двума спосабамі.
У бібліятэку прывезлі 64 падручнікі па матэматыцы і 32 падручнікі па прадмеце «Чалавек і свет». Усе падручнікі былі спакаваныя ў пачкі па 8 падручнікаў у кожнай. Колькі пачак падручнікаў прывезлі?

3. Запішы лікі 60 і 75 у выглядзе сумы зручных складаемых, кожнае з якіх дзеліцца на 5.

4. Знайдзі значэнні выразаў.

80 : 5	90 : 5	50 : 2	70 : 2
72 : 2	72 : 3	72 : 4	72 : 6

5. Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

a	26	?	7	60	0	?
b	2	4	?	?	99	3
$a \cdot b$	?	72	91	60	?	84

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Пафарбавалі $\frac{1}{5}$ частку плота даўжынёй 80 м. Колькі метраў плота засталося пафарбаваць?

7. Вышыня сцябла 14 см. Вусень прапоўз ад пачатку сцябла 9 см, а потым вярнуўся назад на 1 см. Колькі сантыметраў засталося паўзці вусеню да верху сцябла?



8. Знайдзі перыметры трохвугольнікаў.

9. Вызнач даўжыню стараны квадрата, перыметр якога роўны перыметру прамавугольнага трохвугольніка з задачы 8.

Складзі задачы па выразах.

12 : 2 + 8 : 2 (12 + 8) : 2

1. Вылічы.

30 : 2 90 : 2 70 : 5 60 : 4

2. Купілі 100 кг мандарынаў і цукерак. Мандарынаў было 20 кг. У колькі разоў больш купілі кілаграмаў цукерак, чым мандарынаў?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Як падзяліць двухзначны лік на двухзначны?

$48 : 12 = ?$
$2 \cdot 12 = 24$
$3 \cdot 12 = 36$
$4 \cdot 12 = 48$
$5 \cdot 12 = 60$



Разважай так:
1. Спрабую розныя адназначныя лікі множыць на дзельнік.
2. Выбіраю лік, пры множанні якога на дзельнік атрымліваецца дзялімае.

1. Вылічы.

45 : 15	62 : 31	96 : 16
88 : 22	85 : 17	84 : 12

2. У колькі разоў 4 менш за 96? 40? 100?

На колькі 4 менш за 96? 40? 100?

У колькі разоў 96 больш за 6? 2? 8?

На колькі 96 больш за 6? 2? 8?

3. Састаў правільныя роўнасці і няроўнасці, выкарыстоўваючы выразы:

$17 \cdot 4 - 60$ $90 : 5 + 18$ $64 : 8$ $2 \cdot 18$

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Рашы задачу двума спосабамі.
Для пасадкі ў парку купілі 36 саджанцаў клёнаў і 45 саджанцаў ліп. Усе дрэвы пасадзілі ў 9 радоў пароўну ў кожным радзе. Па колькі дрэў пасадзілі ў кожным радзе?

5. Выберы схему. Рашы задачу.
Тату 35 гадоў. Ён у 5 разоў старэйшы за сына. На колькі гадоў тата старэйшы за сына?



6. Складзі і рашы задачу.

Зрабіў за 1 гадзіну (шт.)	Час працы (г)	Усяго зрабіў (шт.)
аднолькава	7	?
	2	18

7. Знайдзі тры лікі, здабытак якіх роўны іх суме.

Растлумач, як можна падзяліць 75 на 15.

1. Вылічы.
84 : 21 65 : 13 78 : 26 87 : 29

2. Для паездкі на экскурсію 42 хлопчыкі і 33 дзяўчынкі селі ў 3 аўтобусы пароўну ў кожны. Колькі дзяцей апынулася ў кожным аўтобусе?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

(18 + 27) : 3 = 6 + ? (56 + 24) : 8 = 7 + ?

(24 + 60) : ? = 2 + 5 (42 + 36) : ? = 7 + 6

(14 + 19) · 3 = ? + 57 (11 + 23) · 2 = ? + 46

2. Вылічы.

30 : 15	60 : 12 · 13	42 : 14 · 10
50 : 25	60 : 15 · 12	96 : 12 · 10
80 : 16	70 : 35 · 41	68 : 17 · 10

3. Знайдзі $\frac{1}{4}$ ад 16 кг; 24 кг; 28 кг; 32 кг; 52 кг; 60 кг.

4. Вылічы.

48 + 39 + 2	28 + 29 + 12 · 1	28 – (5 · 4)
7 · 8 : 7 : 8	(9 · 7) · 0	48 + 4 · 7

5. Параўнай.

10 дм ? 2 дм + 70 см 1 м ? 71 см + 19 см

1 м ? 5 дм + 5 дм 4 дм ? 85 см – 35 см

6. Рашы задачу двума спосабамі.

У гасцініцы для жывёл купілі 60 кг сухога корму для дарослых сабак і 30 кг сухога корму для шчанят. Увесь корм быў расфасаваны ў пакеты па 15 кг кожны. Колькі ўсяго пакетаў з кормам купілі?

7. Гульня ў баскетбол доўжыцца 4 таймы па 10 мін. Спартсмены ўжо гуляюць $\frac{1}{5}$ частку ўсяго часу гульні. Колькі мінут ім засталося гуляць?

Спампавана з сайта www.aversev.by

8. Складзі задачу. Запішы рашэнне выразам. Знайдзі адказ, калі a роўна 40; 60; 72.

Кніг у адным рукзаку	Колькасць рукзакоў	Усяго кніг
4	?	a

9. Даўжыні звёнаў ломанай *LMNO* роўныя 12 дм, 13 дм, 14 дм. Знайдзі даўжыню гэтай ломанай.

10. Рашы задачу, выкарыстоўваючы адказ задачы 9. Якой стане даўжыня ломанай *LMNO*, калі кожнае яе звяно павялічыць на 2 дм?

11. Якая частка кожнага квадрата зафарбавана?

Растлумач, як выканаць дзяленне: 100 : 25.

1. Вылічы.

65 : (46 – 33) · 10 90 : 15 + 70 : 10

2. З трох вагонаў выйшлі 56 пасажыраў. Восьмая частка гэтых пасажыраў выйшла з другога вагона. Колькі пасажыраў выйшла з трэцяга вагона, калі з першага вагона выйшлі 20 чалавек?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Параўнай.

(36 + 28) : 4 ? 36 : 4 + 28 : 4
(60 + 40) : 10 ? 60 : 10 + 40
70 : 7 + 21 : 3 ? (70 + 21) : 7
10 · 3 + 16 · 3 ? (16 + 10) · 3

2. Вылічы. Чым падобныя і чым адрозніваюцца выразы ў кожным слупку?

84 : 7	64 : 2	96 : 24	100 : 10
84 : 3	64 : 4	96 : 48	100 : 25
84 : 2	64 : 8	96 : 96	100 : 50

3. Знайдзі значэнні выразаў.

98 : 2	84 : 4	96 : 3	36 : 2
48 : 24	56 : 28	76 : 38	51 : 17

4. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Памяншаемае	100	100	6 · 13	19 · 2
Аднімаемае	2 · 19	4 · 18	8 · 7	3 · 11

5. Вылічы. Вынік выразі ў гадзінах і мінутах.

100 мін – 39 мін
40 мін + 36 мін
100 мін – 91 мін + 83 мін
80 мін – 65 мін + 75 мін

6. Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

64 + ? = 92 ? – 15 = 49 100 – ? = 36

7. Андрэй з'еў 19 вішань, што складае чацвёртую частку ўсіх вішань у вазе. Колькі вішань засталося ў вазе?

Спампавана з сайта www.aversev.by

8. У магазін «Школьнік» прывезлі 16 пачкаў з альбомамі для малявання і 14 пачкаў з альбомамі для чарчэння. Альбомаў для малявання прывезлі 96. Колькі прывезлі альбомаў для чарчэння, калі ў кожным пачку была аднолькавая колькасць альбомаў?

9. Выберы схему. Рашы задачу.
У Федзі 17 машынак. Калі ён падорыць брату Максіму 2 машынкі, то ў іх машынак стане пароўну. Колькі машынак у Максіма зараз?





10. Даўжыня стараны квадрата *ABCD* роўная 16 см. Прамавугольнік *KLMN* мае такі ж перыметр, як і квадрат *ABCD*. Знайдзі даўжыню адной стараны прамавугольніка, калі даўжыня яго другой стараны роўная 2 дм.

11. Для прадстаўлення ў цырку атлеты падрыхтавалі 5 пудовых гір. Маса ўсіх гэтых гір складала 80 кг. Для свайго нумара атлет узяў дзве пудовыя гіры. Якая маса гэтых двух гір?

1. Вылічы.
(82 – 16) : 22 100 – 51 : 3 45 : 15 · 29

2. Дачцэ 12 гадоў. Яе ўзрост складае $\frac{1}{3}$ частку ўзросту мамы. Мама маладзейшая за тату на 4 гады. Колькі гадоў тату?

Спампавана з сайта www.aversev.by

30 + ? = 35	30 + x = 35	x, y — лацінскія літары
? · 6 = 54	y · 6 = 54	x — чытаем «ікс»
99 – ? = 80	99 – x = 80	y — чытаем «ігрэк»

Ураўненне — гэта роўнасць са зменнай. Рашыць ураўненне — значыць знайсці значэнне зменнай, пры якім роўнасць будзе правільная.

1. Знайдзі і прачытай ураўненні.

36 + 18 = 54	x – 35 = 27	y – 99 = 1
a · 8 = 72	b : 6 = 11	81 : 9 = 9

2. Састаў ураўненні па ўзоры.



x + 8 = 20
8 + x = 20
20 – x = 8





3. Падбяры значэнні зменных, пры якіх роўнасці будуць правільныя.

25 + a = 50 100 – x = 40 y – 0 = 18

4. Падбяры значэнні зменных, пры якіх роўнасці будуць правільныя.

c · 9 = 63 y : 1 = 8 28 : x = 4

5. Вылічы ў слупок. Выканай праверку.

35 + 54	67 + 25	37 + 22
81 – 44	63 – 17	96 – 18

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Рабочы ў магазіне можа перавезці на цялежцы не больш за 100 кг грузу. Маса 5 упаковак з пральным парашком 60 кг. Ці зможа рабочы перавезці на цялежцы 7 такіх упаковак?

7. У атэлье было 48 маткоў шарсцяных нітак. З трэцяй часткі нітак звязалі шалікі. Колькі шалікаў звязалі, калі на кожны пайшло 2 маткі нітак?

8. Даўжыня стараны аднаго квадрата роўная 7 см. Даўжыня стараны другога квадрата 4 см. На колькі сантыметраў перыметр аднаго квадрата большы за перыметр другога квадрата?

9. Начарці ломаную, даўжыня якой вылічваецца так: $3 \cdot 2 + 4 + 1$.

10. Ігар з дапамогай палачак даўжынёй 5 см выклаў квадрат са стараной 20 см і падзяліў яго на роўныя квадрацікі са стараной 5 см. Колькі такіх палачак спатрэбілася Ігару?

Выберы запіс, які з'яўляецца ўраўненнем.

$a + 15$ $a + 15 = 27$ $12 + 15 = 27$

1. Знайдзі значэнні выразаў.

$16 \cdot 5 - 36$ $84 : 7 + 80 : 5$ $90 : (47 - 2) \cdot 11$

2. За 4 г язды на аўтамабілі было патрачана 44 л бензіну. Колькі літраў бензіну спатрэбіцца аўтамабілю на васьмігадзінную паездку?

Спампавана з сайта www.aversev.by

$12 + x = 31$
$x = 31 - 12$
$x = 19$
$12 + 19 = 31$
$31 = 31$



Разважай так:
Невядомы лік x — гэта другое складаемае. Каб знайсці невядомае складаемае, трэба ад сумы адняць вядомае складаемае. Ад 31 аднімаю 12, атрымліваю 19.

$72 - y = 55$
$y = 72 - 55$
$y = 17$
$72 - 17 = 55$
$55 = 55$



Разважай так:
Невядомы лік y — гэта аднімаемае. Каб знайсці невядомае ..., трэба ад памяншаемага адняць ... . Ад 72 аднімаю ..., атрымліваю ... .

$c - 26 = 64$
$c = 64 + 26$
$c = 90$
$90 - 26 = 64$
$64 = 64$



Разважай так:
Невядомы лік c — гэта памяншаемае. Каб знайсці невядомае ..., трэба да рознасці дадаць ... . Да 64 дадаю ..., атрымліваю ... .

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Рашы ўраўненні.

$25 + a = 30$ $\qquad$ $98 - x = 40$

$c + 32 = 76$ $\qquad$ $y - 18 = 35$

2. Люда можа праплысці ў басейне без перапынку 25 м. Гэта трэцяя частка таго, што можа праплысці без перапынку Гена. На колькі больш метраў можа праплысці без перапынку Гена, чым Люда?

3. Складзі і рашы задачу рознымі спосабамі.

Было — ?
Прадалі — 15 пакетаў па 3 кг.
Засталося — 13 пакетаў па 3 кг.

4. Параўнай.

$\frac{1}{4}$ ад 64 см ? $\frac{1}{5}$ ад 70 см $\qquad$ $\frac{1}{2}$ ад 60 л ? $\frac{1}{3}$ ад 60 л

$\frac{1}{7}$ ад 84 кг ? $\frac{1}{6}$ ад 96 кг $\qquad$ $\frac{1}{4}$ ад 48 г ? $\frac{1}{4}$ ад 96 г

Як знайсці значэнне зменнай ва ўраўненнях?

$36 + c = 90$ $\qquad$ $54 - x = 12$ $\qquad$ $a - 28 = 63$

1. Рашы ўраўненні.

$x + 3 = 18$ $\qquad$ $48 - y = 37$ $\qquad$ $c - 99 = 0$

2. Для лыжнага шасцідзённага паходу закупілі 4 упакоўкі з кансервамі па 16 бляшанак у кожнай упакоўцы. Кожны дзень лыжнікі расходавалі па 10 бляшанак. Колькі бляшанак з кансервамі засталося пасля паходу?

Спампавана з сайта www.aversev.by

$x \cdot 6 = 48$
$x = 48 : 6$
$x = 8$
$8 \cdot 6 = 48$
$48 = 48$



Разважай так:
Невядомы лік x — множнік. Каб знайсці невядомы множнік, трэба здабытак падзяліць на вядомы множнік. Дзялю 48 на 6, атрымліваю 8.

$54 : c = 9$
$c = 54 : 9$
$c = 6$
$54 : 6 = 9$
$9 = 9$



Разважай так:
Невядомы лік c — дзельнік. Каб знайсці невядомы ..., трэба дзялімае падзяліць на ... . Дзялю 54 на ..., атрымліваю ... .

$y : 3 = 7$
$y = 7 \cdot 3$
$y = 21$
$21 : 3 = 7$
$7 = 7$



Разважай так:
Невядомы лік y — дзялімае. Каб знайсці невядомае ..., трэба дзель памножыць на ... . Множу 7 на ..., атрымліваю ... .

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Рашы ўраўненні.

$5 \cdot x = 95$ $\quad y : 16 = 6$ $\quad 64 : a = 16$

2. Пастаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя. Вызнач роўнасць, у якой дужкі можна не ставіць.

$25 + 16 - 4 = 37$ $\quad 43 - 20 - 7 = 30$

3. Выберы схему. Рашы задачу.

У маленькім наборы было 12 пірожных, што ў 3 разы менш, чым у вялікім наборы. На колькі больш было пірожных у вялікім наборы, чым у маленькім?



4. Выберы лікі, якімі можна дапоўніць умову задачы. Рашы задачу.

У паходзе тата нёс рукзак масай ... кг. Мамін рукзак быў у ... разы лягчэйшы за татаў. Маса рукзака Пеці была роўная ... кг. Знайдзі масу ўсіх рукзакоў.

24 $\quad$ 4 $\quad$ 3 $\quad$ 100 $\quad$ 63

Як знайсці невядомы множнік? Невядомае дзялімае? Невядомы дзельнік?

1. Рашы ўраўненні.

$48 : x = 12$ $\quad a \cdot 13 = 65$ $\quad c : 7 = 13$

2. У бочцы 50 л вады. Для паліванне агарода ўзялі 4 аднолькавыя вядры вады і яшчэ 4 л вады. Пасля гэтага ў бочцы засталося 14 л вады. Колькі літраў вады змяшчаецца ў адным вядры?

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Рашы ўраўненні.

$63 + x = 80$ $\quad$ $54 - x = 28$ $\quad$ $m - 12 = 88$

$8 \cdot n = 96$ $\quad$ $72 : t = 36$ $\quad$ $y : 7 = 10$

2. Устаў прапушчаныя знакі «+», «−» або «·».
Запішы атрыманыя ўраўненні. Рашы іх.

x ? $5 = 35$ $\quad$ y ? $6 = 54$ $\quad$ x ? $4 = 36$

3. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

Дзялімае	53 + 47	70	100 – 16	8 · 10
Дзельнік	25	64 – 54	6 · 7	48 : 3

4. Выберы схему. Рашы задачу.
У Кірыла ў 5 разоў больш алоўкаў, чым у Вадзіма. У Вадзіма на 20 алоўкаў менш, чым у Кірыла. Колькі алоўкаў у Кірыла?



5. У першым вагоне трамвая ў 4 разы больш пасажыраў, чым у другім. У другім вагоне на 12 пасажыраў менш, чым у першым. Колькі пасажыраў у першым вагоне трамвая?

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Маме 35 гадоў. Мама на 29 гадоў маладзейшая за бабулю. Колькі гадоў унуку, калі яго ўзрост складае $\frac{1}{8}$ частку ўзросту бабулі?

7. Урок доўжыцца 45 мін, а перапынак — 10 мін. Колькі мінут праходзіць ад пачатку аднаго ўрока да пачатку наступнага ўрока?

8. Няхай урок пачынаецца ў 8 г 30 мін. На якім з гадзіннікаў паказана, калі пачынаецца ўрок? Калі заканчваецца гэты ўрок? Калі пачынаецца наступны ўрок?



У якім ураўненні для знаходжання значэння зменнай трэба выканаць дзеянне множання?

$4 \cdot c = 56$ $c : 4 = 14$ $56 : c = 14$

1. Рашы ўраўненні.

$45 + x = 91$ $y - 63 = 17$

$a \cdot 10 = 100$ $84 : b = 6$

2. Першая чарапаха прапаўзла 13 м, а другая — у 3 разы больш метраў. На колькі больш метраў прапаўзла другая чарапаха, чым першая?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Растлумач, як можна начарціць прамавугольнік на паперы ў клетку.



Растлумач, як можна начарціць прамавугольнік на паперы без клетак.



1. Начарці ў сшытку прамавугольнік.



2. Падбяры лікі, пры якіх няроўнасці будуць правільныя.

42 + ? < 45 51 < 56 – ? 40 > ? + 37

Спампавана з сайта www.aversev.by

3. Састаў і рашы ўраўненні.

- Да ліку 34 дадалі невядомы лік і атрымалі 83.
- Невядомы лік паменшылі на 19 і атрымалі 27.
- Лік 25 памножылі на невядомы лік і атрымалі 75.
- Невядомы лік падзялілі на 14 і атрымалі 7.

4. Растлумач, што абазначаюць выразы.
Віця зрабіў 5 вялікіх крокаў па a см кожны і 8 маленькіх крокаў па b см кожны.

$b \cdot 8$ $a \cdot 5$ $b - a$ $a \cdot 5 + b \cdot 8$

5. Даўжыня прамавугольніка *MNOP* у 3 разы большая за яго шырыню і на 18 см большая за шырыню. Знайдзі даўжыні старон гэтага прамавугольніка.

6. У двух наборах было 56 эклераў. Калі з першага набора ўзялі 10 эклераў, у ім засталося 14 эклераў. Колькі эклераў засталося ў другім наборы, калі з яго ўзялі 1 эклер?

Закончы сказ: «Прамавугольнік — гэта чатырохвугольнік, у якога ...».

1. Вылічы.
(84 + 12 · 1) : 32 39 + 68 : 2 : 17

2. Для навагодняга свята ў школе купілі 48 ёлачных шароў па 8 шароў у каробцы. Потым яшчэ 3 такія ж каробкі з шарамі. Колькі ўсяго ёлачных шароў купілі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Як начарціць прамавугольнік з даўжынямі старон 2 см і 1 см?



1. Начарці ў сшытку прамавугольнік з даўжынямі старон 4 см і 2 см. Пачні чарціць так, як паказана на ўзоры. Вылічы перыметр гэтага прамавугольніка.



2. Састаў і рашы ўраўненні.

3. Які выраз «лішні» ў кожным слупку? Знайдзі яго значэнне.

(12 + 21) · 3	(64 + 24) : 4
12 · 3 + 21 · 3	64 : 4 – 24 : 4
3 · (12 + 21)	(24 + 64) : 4
12 · 3 + 21 : 3	64 : 4 + 24 : 4
(21 + 12) · 3	88 : 4

4. Знайдзі значэнні выразу 21 + a : 15, калі a роўна 45; 60; 90.

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Выберы рысунак. Рашы задачу.
Палавіна перыметра прамавугольніка *ABCD* роўная 12 дм. Даўжыня гэтага прамавугольніка ў 3 разы большая за яго шырыню. Знайдзі даўжыні старон прамавугольніка.



6. На дзвюх паліцах было 47 цацак. Калі з адной паліцы знялі 18 цацак, на ёй засталося ў 3 разы менш цацак, чым знялі. Колькі цацак было на кожнай паліцы?

7. Складзі і рашы задачу.

Маса аднаго пакета (кг)	Колькасць пакетаў (шт.)	Маса ўсіх пакетаў (кг)
аднолькавая	4	64
	5	?

Дапоўні сказ: «Каб начарціць прамавугольнік, трэба памятаць, што ўсе вуглы прамавугольніка — ..., а яго супрацьлеглыя стораны ...».

1. Параўнай.
$16 \cdot 6 \;?\; 47 + 48 \cdot 1$ $\qquad$ $(49 + 26) : 5 \;?\; 9 \cdot 10 : 6$

2. Начарці прамавугольнік *KLMN* з даўжынямі старон 3 см і 2 см. Вылічы яго перыметр.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Вылічы.

19 · 4	24 · 3	13 · 7	3 · 27
76 : 4	90 : 2	65 : 5	84 : 6
88 : 22	75 : 25	96 : 16	72 : 24

2. Знайдзі значэнні выразаў.

7 · 1	35 · 1	12 · 1 : 1
7 : 7	35 : 1	20 : 1 · 1
7 : 1	35 : 35	24 : 24 · 0

3. Знайдзі значэнні выразаў.

10 · 4	40 : 4	40 : 10	4 · 10
7 · 10	10 · 7	70 : 70	70 : 7

4. Запішы выразы і знайдзі іх значэнні.

- Суму лікаў 34 і 46 падзяліць на 5.
- Да ліку 16 дадаць здабытак лікаў 18 і 4.
- Да дзелі лікаў 84 і 3 дадаць здабытак лікаў 99 і 0.
- Ад сумы лікаў 31 і 49 адняць дзель лікаў 45 і 15.

5. Вылічы.

(39 + 49) : 11	12 · 4 + (90 – 38)
6 · (58 – 45)	99 : 33 – 72 : 24

6. Састаў выразы па схемах. Вылічы.





Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Вылічы. Выканай праверку.

64 + 31	78 + 7	36 + 23
71 – 29	97 – 22	85 – 38

8. Рашы ўраўненні.

x + 19 = 100	21 + y = 70
x – 23 = 57	81 – y = 16
100 – x = 3	y – 25 = 43

9. Рашы ўраўненні.

5 · x = 95	y · 4 = 84
x · 13 = 52	y : 18 = 4
x : 10 = 6	91 : y = 13

10. Састаў і рашы ўраўненні.

- Да ліку 25 дадалі невядомы лік і атрымалі 57.
- Невядомы лік паменшылі на 18 і атрымалі 52.
- Лік 77 падзялілі на невядомы лік і атрымалі 7.
- Невядомы лік памножылі на 19 і атрымалі 57.

11. Састаў правільныя роўнасці і няроўнасці, выкарыстоўваючы выразы:

4 · 9 | 100 – 36 | 18 + 18 | 8 · 8

12. Якія няроўнасці стануць правільнымі, калі замест знака пытання запісаць лік 6?

66 : ? > 11	? · 12 < 75
15 · ? < 100	84 : ? > 15
60 : ? > 10	96 : ? < 21

Спампавана з сайта www.aversev.by

13. Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

c	13	15	16	18
$100 - c \cdot 3$	?	?	?	?
$5 \cdot c - c$	?	?	?	?

14. Устаў прапушчаныя лікі так, каб атрымаліся правільныя роўнасці.

$27 \cdot 3 = 39 + ?$ $\quad$ $16 \cdot ? = 10 \cdot 8$

$2 \cdot 38 = 100 - ?$ $\quad$ $? \cdot 2 = 100 : 2$

15. Начарці ў сшытку адрэзак даўжынёй 8 см. Начарці адрэзкі, роўныя: $\frac{1}{2}$ гэтага адрэзка; $\frac{1}{4}$ гэтага адрэзка; $\frac{1}{8}$ гэтага адрэзка.

16. Знайдзі $\frac{1}{4}$ частку ад 20 кг; 28 кг; 32 кг; 36 кг.

17. Выразі ў мінутах.

1 г 16 мін | 1 г 49 мін | 1 г 10 мін | 1 г 30 мін

Выразі ў гадзінах і мінутах.

76 мін | 88 мін | 61 мін | 90 мін

18. Параўнай.

68 кг – 27 кг ? 85 кг – 34 кг

49 кг + 34 кг ? 91 кг – 9 кг

80 мін – 1 г 10 мін ? 60 мін – 1 г

42 мін + 53 мін ? 1 г + 35 мін

Спампавана з сайта www.aversev.by

19. Купілі 5 пакетаў з грунтам для расады агародніны і 4 такія ж пакеты з грунтам для расады кветак. Знайдзі масу аднаго пакета, калі ўсяго купілі 54 кг грунту.

20. Складзі і рашы задачу.

	Маса каробкі (кг)	Колькасць каробак (шт.)	Маса ўсіх каробак (кг)
1	аднолькавая	16	48
2		10	?

21. Рашы задачу двума спосабамі.
Для кожнай групы дзіцячага сада трэба набыць 19 набораў каляровай крэйды і 12 набораў белай крэйды. Колькі ўсяго набораў купяць для трох груп?

22. Рашы задачу двума спосабамі.
Настаўніца раздала 36 простых алоўкаў і 54 каляровыя алоўкі 18 вучням пароўну. Колькі алоўкаў атрымаў кожны вучань?

23. Тату 39 гадоў. Узрост сына складае $\frac{1}{3}$ частку ўзросту таты. Дзядуля старэйшы за ўнука на 50 гадоў. Колькі гадоў дзядулю?

24. Дачцэ 9 гадоў. Яе ўзрост складае $\frac{1}{4}$ частку ўзросту мамы. Мама на 24 гады маладзейшая за бабулю. Колькі гадоў бабулі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

25. Рашы задачу двума спосабамі.
У кара́лях у Люды 14 пацерачак. Гэта ў 2 разы менш, чым пацерачак у Ірыных каралях. Колькі ўсяго пацерачак у гэтых двух каралях?

26. На веласіпедзе Міця даязджае да возера за 10 мін, а пешшу траціць у 3 разы больш часу. На колькі мінут больш часу трэба Міцю, каб дайсці да возера пешшу, чым даехаць на веласіпедзе?

27. Дапоўні задачу значэннямі даўжыні, якія падыходзяць. Рашы задачу.
Дарожкі ідуць ад дома да сажалкі, ад сажалкі да агарода, ад агарода да дома. Даўжыня дарожкі ад дома да сажалкі ..., ад сажалкі да агарода ..., ад дома да агарода ... . Якая сума даўжынь усіх гэтых дарожак?

1 м | 20 м | 40 см | 32 м | 5 дм | 25 м

28. Складзі і рашы задачы.

1



2



Спампавана з сайта www.aversev.by

29. Растлумач выразы.

Вучні пятага класа гулялі ў футбол, а вучні чацвёртага класа — у баскетбол. Гульня ў футбол доўжыцца 2 таймы па a мін, а ў баскетбол — 4 таймы па c мін.

$a \cdot 2$ $\quad$ $c \cdot 4$ $\quad$ $a - c$ $\quad$ $a \cdot 2 + c \cdot 4$

30. Які час паказвалі гадзіннікі 1 г таму назад? Які час пакажуць гадзіннікі праз 10 мін?



31. Начарці прамавугольнік *ABCD* з даўжынямі старон 4 см і 3 см. Вылічы перыметр гэтага прамавугольніка.

32. Начарці ломаную з трох звёнаў, даўжыня якой роўная перыметру прамавугольніка з задачы 31.

33. Знайдзі шостую частку перыметра гэтых фігур.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Гэта цікава!

Табліца множання з лікам 9 на пальцах

$9 \cdot 2 = 18$
$9 \cdot 3 = 27$
$9 \cdot 4 = 36$
$9 \cdot 5 = 45$
$9 \cdot 6 = 54$
$9 \cdot 7 = 63$
$9 \cdot 8 = 72$
$9 \cdot 9 = 81$

Каб запомніць табліцу множання з лікам 9, карысна ведаць, што ў ёй ёсць заканамернасці ў запісах значэнняў здабыткаў:

- колькасць адзінак у запісах значэнняў здабыткаў у кожным наступным таблічным выпадку памяншаецца на 1;
- колькасць дзясяткаў у запісах значэнняў здабыткаў у кожным наступным таблічным выпадку павялічваецца на 1.

Табліцу множання з лікам 9 можна запомніць з дапамогай пальцаў рук. Разгледзь, як на малюнку паказаны нумары пальцаў левай і правай рукі.

Выканаем на пальцах множанне ліку 9 на лік 5. Для гэтага знойдзем палец пад нумарам 5 і сагнём яго.

Вызначым колькасць пальцаў злева ад сагнутага пальца — 4 пальцы. Гэтыя пальцы абазначаюць колькасць дзясяткаў. Вызначым колькасць пальцаў справа ад сагнутага пальца — 5 пальцаў. Гэтыя пальцы абазначаюць колькасць адзінак. Значыць, здабытак лікаў 9 і 5 роўны 45.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Старыя меры плошчы

Шмат гадоў таму назад, для таго каб параўнаць і вымераць масы невялікіх прадметаў, людзі выкарыстоўвалі іншыя прадметы, якія мелі вельмі маленькія і амаль аднолькавыя масы, — напрыклад зярняты пшаніцы, ячменю, рысу і інш. Паступова з'явілася агульная назва для такіх маленькіх мер масы — ***гран***. Слова «гран» паходзіць ад лацінскага слова *granum*, што значыць «зерне», «крупінка». Такая маленькая мера масы раўнялася масе сярэдняга ячменнага зярнятка і выкарыстоўвалася ў аптэкарскай справе для ўказання дазіроўкі лекаў.



Для вымярэння мас вялікіх прадметаў выкарыстоўваліся больш буйныя меры масы — напрыклад *фунт* і *пуд*.

Мера масы ***фунт*** была вельмі папулярная ў розных краінах Еўропы і ў Амерыцы. Пакуль краіны не дамовіліся паміж сабой, выкарыстоўваліся неаднолькавыя па масе фунты — напрыклад, былі рускія фунты, партугальскія фунты, дацкія фунты, французскія фунты і г. д. Часцей за ўсё лікавае значэнне фунта было крыху меншае за палову аднаго кілаграма.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Мера масы ***пуд*** выкарыстоўвалася ў Вялікім Княстве Літоўскім і ў Расіі. Яна раўнялася 40 *фунтам*. Гэта старая мера масы адпавядае прыкладна 16 кг. На малюнку ты бачыш пудовую гіру, маса якой 16 кг. Такую гіру і зараз выкарыстоўваюць спартсмены на трэніроўках.

Кілаграм

Карыстацца мерамі масы, якія прымяняліся ў розных краінах, стала нязручна, калі паміж жыхарамі гэтых краін пачаліся рэгулярныя зносіны і гандаль. З'явілася неабходнасць у стварэнні агульнай для розных краін сістэмы мер масы.

Адной з такіх мер масы стаў ***кілаграм***, дакладны ўзор якога быў зроблены людзьмі са спецыяльнага сплаву металаў. Гэты ўзор захоўваецца ў Францыі, непадалёку ад Парыжа. Яго ты бачыш на фатаграфіі. Існуюць і іншыя агульныя для розных краін меры масы, з якімі ты пазнаёмішся пазней: *грам, цэнтнер, тона*.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Мураўёва, Г. Л.
М91 Матэматыка : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : у 2 ч. / Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — Ч. 1. — 136 с. : іл.
ISBN 978-985-559-872-6.

УДК 51(075.2=161.3)
ББК 22.1я71

Вучэбнае выданне

Мураўёва Галіна Леанідаўна
Урбан Марыя Анатольеўна

МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

2-е выданне, выпраўленае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Мастакі *І. А. Усенка, Ю. М. Галавейка, М. М. Рудакоўская*
Мастацкі рэдактар *Л. М. Рудакоўская*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *К. В. Шобік, Д. Р. Лосік*

Падпісана ў друк 05.05.2017. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,95. Ул.-выд. арк. 4,66. Тыраж 7470 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Спампавана з сайта www.aversev.by

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Спампавана з сайта www.aversev.by